Тыднёвік Магілёўскі



№ 19 (60) 13 траўня 1999 г. Кошт свабодны

ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ: ЗА КРОК ДА ФІНАЛУ

ПРЫ НАСТУПНЫМ СПАТКАНЬНІ БУДЗЕМ ВЕДАЦЬ УСЁ, ШТО ВЫЗНАЧАЕЦЦА СЛОВАМ: ВЫНІК





А пакуль маем паведаміць чытачам толькі тое, што ведаем на сёньняшні дзень. Галоўнае: выбары распачаліся і ідуць. Па інфармацыі абласной выбарчай камісіі на ўчорашні дзень па вобласьці ў іх прынялі ўдзел больш за 200 тысячаў грамадзянаў з 1 млн. 20 тыс. чалавек, што маюць права голасу. Побач з гэтым немагчыма абмінуць увагай яшчэ адну лічбу: за першыя дні кампаніі толькі ў абласным цэнтры былі адміністратыўна затрыманыя больш за 30 яе актывістаў.

Па нашым журналісцкім назіраньні выбары ў Магілёве пачаліся, калі так можна сказаць, з пэўнай паўзай. Рэпрэсыўны міліцыянскі каток, які ні на адзін дзень не спыняў свае абароты (аб гэтым – у іншых матэрыялах нумару), нанёс адчувальны ўрон мясцовым дэмакратычным шэрагам і тэхнічна-матэрыяльным сродкам, якія былі неабходныя для арганізаванага пачатку працэсу. Магчыма, пэўную неарганізаванасьць праявілі «выбарчыя функцыянэры». Аднак, як сьведчаць дадзеныя абласной камісіі, справа на гэты час выглядае ня горшай, чым у іншых рэгіёнах краіны.

Выбары заканчваюцца 16 траўня. Чарговы выхад «ТМ» – у наступны чацьвер. Разам з вамі спадзяемся, што газэта будзе валодаць выніковай інфармацыяй па ўсіх, так бы мовіць, парамэтрах гэтай, найбольш значнай за ўсе апошнія гады, беларускай палітычнай падзеі.

Але, відавочна, што самая гэтая падзея ў суверэнным календары краіны апошняй яшчэ ня стане. Магчыма, што яна – толькі першы значны крок на шляху грамадзкага абуджэньня.

Рэдакцыя «ТМ»

Дзень Перамогі міліцыя сьвяткавала па-свойму

Травеньскія выбары прэзыдэнта не даюць спакою міліцыі ні ў будні, ні ў сьвяты. Пакуль у Магілёве праходзілі пераможныя парадныя ўрачыстасьці, спэцнерад міліцыі блякаваў офіс мясцовай управы БНФ, дзе адначасова разьмяшчаецца абласная выбарчая камісія. «Баявымі» дзеяньнямі ўзвода кіраваў маёр Чумакоў. Міліцыянты, па яго словах, атрымалі тэлефонную «наводку» (зразумела, ананімную) аб тым, што ў памяшканьні захоўваецца зброя. Аднак у выніку ператрусу нападнікам удалося толькі знайсьці і сканфіскаваць некаторую колькасьць дакумэнтаў і матэрыялаў, што былі вызначаныя як ня менш небясьпечныя, чым зброя: выбарчыя бюлетэні, запрашэньні на выбары, пратакольныя блянкі, заявы аб датэрміновым галасаваньні і г.д. Прысутных у офісе людзей падчас ператрусу здымаў на відэакамэру спэцаператар. Усе, хто падчас 3-гадзіннага ператрусу знаходзіўся ў офісе, пасобку былі дастаўленыя ў Цэнтральны РАЎС, дзе ад іх былі ўзятыя тлумачэньні аб прычыне іхняга знаходжаньня ў памяшканьні.

Міліцэйская апэрацыя тым часам мела «аўтавакзальны працяг». На аўтавакзале «апэрацыяй» кіраваў ст. інспэктар крымінальнага вышуку абласнога ўпраўленьня ЎС Іван Галапобаў. Тут былі затрыманыя актывісты выбарчай кампаніі Анатоль Фёдараў і Алег Дзячкоў, якія зьбіраліся ехаць маршрутным аўтобусам у Бабруйск. Паколькі затрыманыя адмовіліся на вакзале падвяргацца вобшуку, іх гвалтоўна даставілі ў Ленінскі РАЎС, дзе сканфіскавалі з асабістых пакункаў затрыманых дакумэнты, што мелі дачыненьне да выбараў.

Сёньня сканчаецца трохдзённы тэрмін зьняволеньня сябра ўчастковай камісіі па выбарах прэзыдэнта Ігара Лукіча Стукалава. Ён быў асуджаны на адміністрацыйны арышт за «непадпарадкаваньне законным дзеяньням міліцыі». Спадар Стукалаў быў схоплены адразу пасьля выхаду з памяшканьня абласной выбарчай камісіі, дзе атрымаў матэрыялы для правядзеньня выбараў, якія былі сканфіскаваныя.

Аляксей КОЛЧЫН,
прадстаўнік ПЦ «Вясна-96» па магілёўскаму рэгіёну

Ад рэдакцыі. Падобныя міліцэйскія дзеяньні адбываліся сьвяточнымі днямі ў Буйнічах, Глуску, Бабруйску, Крычаве, Чэрыкаве, Касьцюковічах, Шклове. Паколькі раённыя актывісты выбарчай кампаніі бядней за «сталічных» на памяшканьні, міліцыянты наведвалі іх непасрэдна па месцы жыхарства. У Глуску, напрыклад, былі абшуканыя ўласныя кватэры Ігара Крына і Марыі Дзьякавай. Праводзілі гэтыя дзеяньні капітаны Ешчык і Кузьмянкоў. На кватэрах актывістаў былі знойдзеная і сканфіскаваная невялікая колькасьць дакумэнтаў на «выбарчую тэму». Разам з тым міліцыянты прыхапілі ўсё, што выклікала ў іх падазрэньне ў «падрыўным» характары папераў. Сярод сканфіскаваных матэрыялаў была, напрыклад, Рэзалюцыя Эўрапарлямэнту аб сытуацыі ў Беларусі з правамі чалавека. Добра, калі міліцыянты зь ёй пазнаёмяцца.

У мястэчку Буйнічы нарадам міліцыі падчас абыходу жыхароў раёну, якія хацелі прагаласаваць за кандыдатаў у прэзыдэнты, былі затрыманыя сябры ўчастковай камісіі Міхась Нарановіч і Андрэй Таркан. У іх былі сканфіскаваныя ўсе дакумэнты, датычныя выбараў, у тым ліку апячатаныя скрыні для галасаваньня, аб чым быў складзены пратакол.

ЗВАРОТ МАГІЛЁЎСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ ПРАВААБАРОНЧАГА ЦЭНТРУ «ВЯСНА-96»

Нашая арганізацыя вядзе маніторынг парушэньняў Канстытуцыі і законаў падчас выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, прызначаных на 16 траўня.

З мэтай дапамогі пацярпелым і абароны іхных правоў просім усіх, чые правы былі парушаныя, каго за ўдзел у выбарчай кампаніі прыцягвалі да адказнасьці ці выклікалі ў міліцыю, пракуратуру, суд, КГБ, паведамляць пра гэта ў нашую арганізацыю.

Наш адрас: Магілёў, вул. Ленінская 27, кв. 50
Тэлефоны: 32 - 33 - 43, 25 - 64 - 73
Адрас для лістоў: 212001, Магілёў, вул. Бялінскага, 22 - 13

Старшыня МА ПЦ «Вясна-96» Аляксей Колчын

НЕДАПУШЧАЛЬНА СПЭКУЛЯВАЦЬ ВАЙНОЙ

У сядзібе абласной арганізацыі БНФ «Адраджэньне» днямі адбыўся круглы стол-абмеркаваньне на тэму: «Югаславія – Касова: права на сьмерць». Ладзіла мерапрыемства гарадзкая арганізацыя Маладога Фронту пры падтрымцы магілёўскага аддзяленьня Праваабарончага Цэнтру «Вясна-96».

Прысутныя выслухалі даклад выкладчыка гісторыі мясцовага дзяржаўнага ўнівэрсытэту Уладзімера Барысенкі аб асаблівасьцях утварэньня краін і сучасным становішчы народаў Балканскага рэгіёну. Супрацоўнік «Вясны-96» Аляксей Колчын зрабіў агляд міжнародных прававых нормаў, датычных захаваньня правоў асобы пры вядзеньні баявых дзеяньняў. У ходзе дыскусіі, якая доўжылася амаль тры гадзіны, удзельнікі прыйшлі да агульнай высновы аб недапушчальнасьці тэрору супраць цывільнага насельніцтва. Прысутныя ўсьвядомілі недапушчальнасьць выкарыстаньня трагічных падзеяў у Югаславіі ва ўнутраных палітычных мэтах і зразумелі важнасьць і неабходнасьць захаваньня асноўных правоў чалавека нават ва ўмовах вайны.

Уласная інфармацыя

КРОНІКА ТЫДНЯ: ПАДЗЕІ І ФАКТЫ

Заўтра пройдзе роўна тыдзень з таго часу, як у Менску пры невядомых абставінах зьнік былы міністар унутраных справаў Юры Захаранка. Апошнім часам ён стаўся адным з самых прыкметных апазыцыянэраў прэзыдэнту. Гэтымі днямі ён узначальваў перадвыбарчы штаб аднаго з двух кандыдатаў на выбарах 16 траўня – Міхаіла Чыгіра. Па меркаваньні жонкі былога міністра і ягоных паплечнікаў, зь ім магло здарыцца самае горшае, бо Захаранка ў апошнія дні адчуваў за сабой пільнае сачэньне з боку «невядомых людзей у цывільным». Каардынацыйны Савет дэмакратычных сілаў Беларусі прыняў рашэньне аб утварэньні грамадзкага камітэту па ягоным вызваленьні, бо ўпэўнены ў тым, што «зьнікненьне» Юрыя Захаранкі зьвязанае зь яго палітычнай дзейнасьцю.



Традыцыйным шэсьцем вэтэранаў вайны ад цэнтральнай плошчы да мемарыялу па-над Дняпром было адзначанае ў Магілёве 9 Мая. На чале шэсьця, таксама традыцыйна, шпацыравала абласное і гарадзкое начальства, а ўжо за ім нетаропка рухаліся вэтэраны, калёна якіх прыкметна памяншаецца з кожным годам. Наперадзе ўсіх, у атачэньні парадназа ўзвода сёньняшніх салдатаў, ваенны бронетранспарцёр вёз на борце традыцыйную гірлянду славы і памяці. За вэтэранамі маршыравалі аркестры, за імі – народ. Гэтым разам асабліва шмат было моладзі, па выгляду студэнцкай і школьнай. Ім даверылі несьці чырвоныя сьцягі і рэдкія партрэты прэзыдэнта. Дзень скончыўся фэервэркам, кожны стрэл якога шумліва вітала тая-ж, але ўжо прыкметна «падлітая» моладзь.

Нечакана ўрачыста адзначыла абласное і гарадзкое начальства Дзень друку. Магчыма, з раднаснай нагоды вяртаньня гэтага сьвята на дзень нараджэньня – 5 мая – ленінскай газэты «Правда». Дом друку, дзе разьмешчаныя ўсе афіцыйныя газэты і «апалітычнае» выдаўніцтва «Талака», у гэты дзень наведалі старшыні абласнога і гарадзкога выканкамаў, міліцэйскія чыны, кіраўнікі іншых абласных ведамстваў. Лепшым, на думку начальства, журналістам афіцыйных газэтаў, радыё і тэлебачаньня былі ўручаныя граматы і нават грашовыя прэміі. Журналістаў незалежных друкаваных выданьняў, супрацоўнікаў 2-га гарадзкога тэлеканала на гэтай урачыстасьці заўважана не было. Верагодна, што аб іх існаваньні начальства проста ня ведае. Падобна, аднак, на тое, што гэтых журналістаў кіраўніцтва вобласьці, як і краіны, лічыць «не сваімі». Дарэчы, правільна робіць – калі мець на ўвазе, у прыватнасьці, «ТМ».

На веснавыя палявыя работы зараз «мабілізуюцца» ня толькі гарадзкія жыхары, якія валодаюць сельскагаспадарчымі прафэсіямі, але й студэнты, школьнікі і беспрацоўныя. Для апошніх устанаўліваюцца «нормы» своеасаблівай працоўнай павіннасьці. На гэты конт райвыканкамы прымаюць спэцыяльныя рашэньні, зь якіх вынікае, што памер дапамогі, якую атрымлівае беспрацоўны, можа быць зьменшаны ў выніку невыкананьня ім устаноўленай колькасьці працадзён на вёсцы.

Старшыням калгасаў Горацкі выканкам ня даў адпачыць ні 1-га, ні 2-га траўня. Два дні запар тут праходзіла «пасяўное» паседжаньне, на якім спэцыялісты аблсельгасхарчу дакладалі свае назіраньні аб якасьці палявых работаў. Яна была прызнаная, і справядліва, незадавальняючай. Засмучаюць толькі прынятыя з гэтай нагоды меры: 8 кіраўнікоў гаспадарак (у раёне, здаецца, 12 калгасаў) атрымалі вымовы і строгія папярэджаньні. Ім бы, як той казаў, «падкінуць» тэхнікі, запчастак, паліва, дапамагчы наладзіць гарачае і прыстойнае харчаваньне людзей у полі... Аднак рэальна выканкам удосталь мае толькі тое, што мае: уладу, нэрвовасьць і боязь быць абвінавачаным у «попустительстве».

Старшыня Быхаўскага райвыканкама сп. Гунёў у сьвяточнай прамове на мітынгу 1-га траўня ўдзячна пералічыў практычна ўсе прадпрыемствы і гаспадаркі раёна. Сапраўды, людзі вартыя слоў удзячнасьці і павагі за сваю працу. Не адзначыў старшыня толькі такую характэрную рысу сёньняшніх працоўных людзей, як іх цярпеньне і трываласьць. А можа, за гэтымі якасьцямі хаваецца і нешта зусім іншае, калі ўзгадаць прымаўку «аб жабраках, якія на прыдумкі хітрыя». Інакш цяжка зразумець, як можна «старанна працаваць на фэрмах», калі заробак тут ня плоцяць з пачатку года. Альбо людзі харчуюцца цярпеньнем, альбо – тым, што даюць «дзяржаве» калгасныя буронкі і парсючкі, якіх пакуль кормяць амаль рэгулярна.

Па дадзеных міністэрства будаўніцтва ў беларускіх вёсках зараз пустуе звыш 80 тысячаў дамоў. Іх гаспадары альбо даўно зьехалі з краю, альбо памёрлі. Фармальна гэтыя хаціны належаць сваякам, якія аднак не пражываюць у вёсках і не вядуць тут ніякай гаспадаркі. Міністэрства зьвярнула на гэта сваю ўвагу па прычыне жыльлёвага «рэзэрву». А нас уразіла колькасьць кінутых дамоў, што пераканаўча сьведчыць пра нібыта «пад'ём сельскай гаспадаркі» за апошнія гады, як аб гэтым не стамляецца паведамляць афіцыйная прапаганда.

Дзе яшчэ тая зіма, а ў Мсьціславе ўжо зараз ведаюць, што торфабрыкету насельніцтву ня хопіць. Ягоныя пастаўкі ў раён сёлета значна паменшацца, як гэта, дарэчы, адбываецца ўсе апошнія гады. Прычына – ў вадсутнасьці бюджэтных сродкаў на аплату здабычы і дастаўкі брыкету. Ня плоцяць нарыхтоўшчыкам і прадпрыемствы. А пакутваюць, як заўсёды, звычайныя спажыўцы. Прадпрыемства-ж у нас ня спыніш, нават калі яно поўны банкрут, а людзі могуць паклапаціцца пра сябе і самі, дарма што – пад прапагандысцкі акампанімэнт на тэму «дасягненьняў сацыяльнай палітыкі».



У шэрагу раёнаў заўважана цікавасьць да пытаньняў так званай «грамадзянскай абароны». Магчыма, што начальству і сумуючым бяз працы «ваенрукам» час для актывізацыі работы ў гэтым напрамку падаўся зручным на фоне «агрэсыі НАТАўскай ваеншчыны супраць братняй Югаславіі». У Круглым для старшаклясьнікаў наладзілі шматгадзінныя заняткі з «противогазами» (дарэчы, састарэлымі па магчымасьцях і форме), а ў Касьцюковічах пытаньне стану ГА нават вынесьлі на абмеркаваньне выканкама, дзе вялася гаворка пра неабходнасьць «падтрыманьня ўстойлівага функцыянаваньня эканомікі ў надзвычайнай сытуацыі».

Інфармацыйная служба «ТМ»

КРОНІКА ТЫДНЯ: ПАДЗЕІ І ФАКТЫ

ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ: ДА ЗАКАНЧЭНЬНЯ 4 ДНІ

БЮЛЕТЭНЬ

па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

16 траўня 1999 года

Кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

Пакідаецца ў бюлетэні прозвішча кандыдата ў Прэзідэнты, за якога Вы галасуеце, а астатнія выкрэсліваецца

Прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь	Дата нараджэння, займаемая пасада(занятак), месца працы, партыйнасць
1	2
ПАЗЬНЯК Зянон Станіслававіч	24 красавіка 1944 года нараджэння, Старшыня Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне", сябра партыі Беларускага Народнага Фронту
ЧЫГІР Міхаіл Мікалаевіч	24 траўня 1948 года нараджэння, прэзідэнт прадстаўніцтва "ГЕА", беспартыйны

Бюлетэнь, у якім пры галасаванні пакінута больш аднаго кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, прызнаецца несапраўдным

Кроніка напружаньня

Наша прадмова. *Пераадолеўшы на сваім шляху нямала самых розных перашкодаў, сёлетняя прэзыдэнцкая выбарчая кампанія ледзь не абарвалася па «ўнутрыпалітычных разыходжаньнях», пра якія чытайце ў гэтай кроніцы крызыснага моманту. Здаецца, ён пераадолены, навошта зьвяртаць увагу... Аднак напружанасьць узьнікла не на пустым месцы. Прынцыповыя меркаваньні, што прагучалі падчас яе кульмінацыі, для нашага грамадзтва маюць, як падаецца, не пераходзячы, а хутчэй – пэрспэктыўны характар. Неразумна, на нашую думку, «прапускаць» такія старонкі своеасаблівага падручніка па сучаснай беларускай гісторыі.*

Крыху больш тыдня таму, пасьля абвешчаньня Цэнтравыбаркамам рашэньня аб парадку галасаваньня, ***Зянон Пазьняк*** *даслаў ліст Сойму БНФ, у якім даў сваю ацэнку датэрміноваму галасаваньню па выбарах прэзыдэнта. У ім, у прыватнасьці, гаворыцца:*

«Пастанова Цэнтравыбаркаму № 192 аб парадку галасаваньня па выбарах прэзыдэнта РБ 16 траўня 1999 г., прынятая 28 красавіка, поўнасьцю перакрэсьліла Закон аб выбарах прэзыдэнта РБ. Пастанова грунтуецца не на Законе, а на нейкіх неакрэсьленых прынцыпах правядзеньня выбараў. Пры гэтым мяркуецца, што сябры ўчастковых выбарчых камісіяў, якіх ЦВК яшчэ не стварыла, будуць на працягу 10-ці дзён хадзіць са скрынямі галасаваньня па дамох і прапаноўваць выбаршчыкам галасаваць. Грубае парушэньне Закону і авантурызм тут відавочныя. Пакватэрны мэханізм усеагульных выбараў нават чыста тэхнічна невыканальны. Пакватэрнага мэханізму ўсеагульных выбараў нідзе ў заканадаўстве не існуе. На што-ж тады разьлічваюць ініцыятары такой справы? На адно з двух – альбо на палітычнае самазабойства, альбо, як і Лукашэнка, на фальсыфікацыю коштам Народнага Фронту і на маніпуляцыю палітычнымі вынікамі афэры, якія яны зробяць як захочуць. Мы прапаноўвалі ад БНФ дзейнічаць толькі па Закону – стварыць выбарчыя ўчасткі для галасаваньня (мэханізм быў прапанаваны) і галасаваць нармальна – ўвадзін дзень. Нават калі б галасаваньне доўжылася ўсяго 5 хвілінаў і было б спыненае сіламі рэжыму, – юрыдычная, палітычная і маральная перавага і праўда засталіся б за намі, а выбары, перапыненыя сілай, на гэтым не спыніліся б і маглі быць у зручны момант аднoўленыя ізноў – скажам, адразу пасьля 20-га ліпеня. Кіраўніцтва ЦВК да гэтага часу не стварыла ўчастковых выбарчых камісіяў, не падрыхтавала сьпісаў выбаршчыкаў. А як быць з агітацыяй за кандыдатаў? Па Закону на гэта даецца 20 дзён. Але па Закону ў часе галасаваньня не дазволеная ніякая агітацыя, а тэарэтычнае галасаваньне па Ганчару павінна пачацца 6-га траўня. Юрыдычна безадказнае становішча, якое стварыў з выбарамі В.Ганчар, паказвае, што кіраўніка Цэнтравыбаркаму за правальваньне выбарчай кампаніі цяпер трэба тэрмінова здымаць і прызначаць іншага».

Вось што адказаў на гэтую заяву ***Віктар Ганчар:***

«Што тычыцца пазыцыі Цэнтральнай камісіі, то яна бездакорна акрэсьлена ў нашай пастанове. Я хачу ў гэтай сувязі зьвярнуць увагу, што толькі Цэнтральная камісія ў вадпаведнасьці з Законам можа даваць абавязковыя рэкамэндацыі па прымяненьню дзеючага заканадаўства. І камісія выканала сваю ролю. Улічваючы, што Закон павінен прымяняцца заўсёды, нават тады, калі дзеючая ўлада тарпэдуе яго выкананьне, ЦВК дзейнічае рашуча й прагматычна. Што тычыцца чарговых заяваў З.Пазьняка, то мы вырашылі на паседжаньні камісіі, што, улічваючы напружанасьць працы, ня маем часу для таго, каб рэагаваць на іх. І зараз, калі пачынаецца найбольш актыўны, важкі і адказны момант выбарчай кампаніі, я лічу, што гэтая заява не да месца і шкодзіць працы».

8 траўня быў скліканы Сойм БНФ, на якім выконваючы абавязкі старшыні Фронту ***Лявон Баршчэўскі*** *заявіў, што сябры арганізацыі, якія ўваходзяць у выбарчыя камісіі, будуць выконваць законныя пастановы ЦВК. Намесьнік старшыні БНФ* ***Вінцук Вячорка*** *паведаміў прысутных, што абазнаныя ў заканадаўстве юрысты і праўнікі лічаць згаданую Зянонам Пазьняком Пастанову ЦВК законнай. Пры гэтым Сойм зазначыў, што кіраўніцтва Цэнтравыбаркаму выканала свае абяцаньні толькі на 10%, а на 90% выбары сапраўды тэхнічна не падрыхтаваныя.*

Тым ня менш Сойм прыняў Ухвалу, у якой зьвярнуўся да ЦВК з просьбай прысьпешыць выраб улётак, вызначыць канкрэтныя месцы для галасаваньня ў апошні дзень выбараў – 16 траўня і своечасова паінфармаваць аб гэтым грамадзянаў. Народны Фронт, адзначаецца ва Ўхвале, са свайго боку робіць усё, каб выбарчая кампанія адбылася.

Наш камэнтар. *Трэба зазначыць, што сапраўды працэдура «пакватэрнага галасаваньня» не прадугледжаная Законам, а ўсе заўвагі, заявы і прапановы кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі Зянона Пазьняка, якія ён рабіў на працягу падрыхтоўкі выбарчай кампаніі, былі скіраваныя менавіта на тое, каб арганізатары выбараў зьдзейсьнілі ўсю працэдуру ў строгай адпаведнасьці Канстытуцыі 1994 года. Нягледзячы на тое, што многія выбарчыя актывісты падтрымліваюць пазыцыю З.Пазьняка (да таго-ж, у пераважнай большасьці, гэта сябры БНФ), яны падпарадкоўваюцца ў дадзеным выпадку Цэнтравыбаркаму й Вярхоўнаму Савету 13 скліканьня, якія вырашылі па-свойму. Такім чынам, пры адсутнасьці сьпісаў выбаршчыкаў, пры не да канца створаных участковых камісіях, пры шмат якіх яшчэ тэхнічных і арганізацыйных недахопах ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАНЬНЕ ПА ВЫБАРАХ ПРЭЗЫДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ІДЗЕ З 6-ГА ТРАЎНЯ. ЯНО ЗАВЯРШАЕЦЦА ПРАЗ 4 ДНІ.*

Рэдакцыйны АГЛЯДАЛЬНІК пошты й друку



РАДЫЁ СВАБОДА
BELARUS SERVICE RFE/RL

Слоўнік Свабоды



Сёлета ад пачатку года Беларуская Служба радыё Свабода вядзе рубрыку «Слоўнік Свабоды. XX стагодзьдзе ў беларускай мове. Слова на дзень для памяці і для роздуму». «ТМ» вырашыў скарыстаць гэтыя матэрыялы ў друкаваным выглядзе з тым, каб дапамагчы нашым чытачам атаясамляць сябе й свае мары з нашай агульнай беларускай ПАМЯЦЬЦЮ І ГІСТОРЫЯЙ.

Шлях

Калі б мяне папрасілі адным словам выказаць увесь беларускі лёс зь ягоным бясконцым цярпеньнем і рэдкім шчасьцем, я б вымавіў слова *шлях*. Бо шлях – гэта й ёсьць лёс, які мы праходзім *шляхам жыцьця* або *шляхам гадоў*. Увесь наш досьвед і сэнс нашага руху па зямлі ўвабрала гэтае слова. Таму цэлая беларуская газэта або кніга можа называцца кароткім знакавым словам «Шлях». Каб адчуць гэтую знакавасьць, варта параўнаць шлях з нэўтральным, амаль службовым словам *дарога*. Дарога вядзе да школы, а шлях – да асьветы, дарога – да лякарні, а шлях – да ацаленьня, дарога – да царквы, а шлях – да Бога. Шлях, у вадрозьненьне ад дарогі, не бывае просты, кароткі або лёгкі. Ён – біты, пакручасты, Чарнобыльскі шлях.

Па беларускім бітым шляху,
Б'ючы ў кайданавы званы,
Брыдзе чужынец, а зь ім побач
Хто? – Беларускія сыны!

Дарогі сыходзяцца, разыходзяцца і сыходзяцца зноў, шляхі разыходзяцца назаўжды.

Калі чалавек кажа: падкажыце, калі ласка, просты шлях, – гэта значыць, што ён не адчувае розьніцы з расейскім словам «путь». Нельга сказаць, напрыклад, пра «русский путь», а пра «беларускі шлях» толькі й можна гаварыць. Няма ў нас і вытворных, кшталту расейскага «путник», бо па нашым шляху ідуць усе беларусы – падарожнікі і дамаседы, старыя і маладыя, мужчыны і жанчыны, багатыя і бедныя. Шлях наш – усіхны. Таму недарэчна гучаць савецкія назвы беларускіх калгасаў і раённых газэт: «Шлях Леніна», «Шлях камунізму», «Сьветлы шлях». Як, зрэшты, і назва заходнебеларускага часопіса «Шлях моладзі».

Асабіста мне слова шлях уяўляецца дужым круглатварым і чарнабародым словам-царом, якое ўзвышаецца над сынанімічным шэрагам: дарога, тракт, шаша, гасьцінец, бальшак... Шлях – вялікшы і мудрэйшы за іх.

Шмат хто скажа, што шлях беларусаў ляжыць да саміх сябе. Але ніхто ня ведае, куды ён прывядзе.

Сяргей ДУБАВЕЦ

Канфіскацыя

Агульнапрынятае значэньне слова *канфіскацыя* – прымусовае, бязвыплатнае і незваротнае адабраньне грошай або маёмасьці ва ўласнасьць дзяржавы.

Атабраць, вылучыць, – пераклад гэтае лацінскае з паходжаньня слова на нашую мову Вацлаў Ластоўскі. Адна зь першых антыбеларускіх акцыяў нашага стагодзьдзя – канфіскацыя, а потым і закрыцьцё першай легальнай Беларускай газэты «Наша доля».

Канфіскацыя – заплянаваны рэпрэсыўны сродак змаганьня савецкай улады з эксплюататарамі. Саветы сканфіскоўвалі ўсё: сродкі вытворчасьці, заводы, зямлю, грошы, прадукты, каштоўнасьці. У шэрагі эксплюататараў былі ўлучаныя звычайныя, але дбайныя і працавітыя людзі, якія з уласнага мазаля выбіліся ў моцных гаспадарнікаў і ў людзкай краіне маглі б стаць апірышчам моцнае эканомікі.

Разам з канфіскаванай маёмасьцю савецкая дзяржава забрала й чалавечыя жыцьці. Калі ўсё звязанае з гаспадаркай было забранае, падзеленае і занядбанае, слова канфіскацыя працягвала квітнець у галіне культуры.

Тэрмін набыў значэньне забароны на карыстаньне творамі друку, а таксама на продаж гэтых твораў. Канфіскацыі кнігаў, пэрыёдыкаў або асобных матэрыялаў у іх здушылі вольнае слова ў Савецкай і актывізавалі яго ў Заходняй Беларусі. Канфіскацыя сталася сынонімам забароны.

Канфіскацыя апошнім часам нарадзіла мойчага выраз: слова канфіскат, якім абазначаюцца прадукты харчаваньня й іншыя рэчы, забраныя ў нашых грамадзянаў на беларускіх мытнях. Канфіскатам можа быць што заўгодна: яйкі, каўбаса, масла. Гэтыя рэчы ня можна вывозіць зь Беларусі.

Сярод апошніх канфіскацыяў стагодзьдзя – канфіскацыі незалежных выданьняў, вершаў і прыватных запісаў паэта Славаміра Адамовіча, перадвыбарчых улётак Міхаіла Чыгіра і Зянона Пазьняка.

Сяржук СОКАЛАЎ-ВОЮШ

Падаткі

Падаткі... Слова гэтае наводзіла жах на кожнага чалавека. І ў першыя гады бальшавіцкай улады, і асабліва пасьля вайны 1941-1945 гадоў. Кажу «пасьля вайны», а на думку прыходзіць, што вайна бальшавікоў з народам нікопі і не скончалася.

Падаткі – аддаваць, падаць, даніна, подаць. І міласьціна – таксама подаўка.

Падаткамі, ды такімі вялікімі, абкладаліся аднаасобнікі, саматужнікі, каб змусіць іх іхаці ў калгасны прыгон, у першабытную арцель. Падаткамі абкладалася ўсё – ад жывёлы да расьліны: каровы й сьвіньні, куры й трусяняты, яблыні й вішні, кусты агрэсту й клубніцаў.

За няўплату падаткаў забіралі апошнюю кароўку, карміцельку ўсёй сям'і, гаспадар якой загінуў на фронце ці ў партызанах. Хадзіў нават сумны жарт: шкілет – самы прыкладны савецкі падаткаплацельшчык, бо здаў мяса, воўну, яйкі...

Другой па жаху фігурай пасьля энкавэдыста быў падатковы інспэктар. Гэта ён у суправаджэньні ўчастковага міліцыянта вёў за сабою лямант, роспач. Гэта яго клялі мёртвымі клятамі, хоць ён быў толькі выканаўца скурадзёрнай улады. І хадзіла сумная загадка: не сабакі, а брэшуць і кусаюць за пяткі. Хто? – Падаткі.

Рыгор БАРАДУЛІН

Небясьпечнае супадзеньне намераў

Напярэдадні сьвята Перамогі цэнтральныя вуліцы Магілёва былі абклееныя ўлёткамі «ад Расейскага нацыянальнага адзінства» (РНЕ) з фашыстоўскай свастыкай і адпаведным тэкстам. А міліцыя ў гэты час актыўна шчыравала супраць мясцовых дэмакратычных актывістаў.

Акцыя РНЕ мела акрэсьлены характар правакацыі. Улёткі заклікалі «расейскіх патрыётаў» да барацьбы за «рускі парадак і адnаўленьне вялікай Расейскай імпэрыі». Фашыстоўскай сымболікай спаганілі сьцены гарадзкога дома культуры, побач зь месцам заняткаў нядзельнай габрэйскай школы, а таксама слупы на шляху і непадалёк да габрэйскіх могілак.

Як лічыць старшыня магілёўскага Праваабарончага цэнтру Валадар Цурпанаў, цярпімасьць з боку ўладаў да гэтых фашыстоўскіх выхадкаў тлумачыцца супадзеньнем памкненьняў беларускага кіраўніцтва і РНЕ да аднаўленьня – хаця-б у складзе «славянскіх рэспублікаў» – СССР, які для «расейскіх патрыётаў» ёсьць сынонімам адзінай і непадзельнай імпэрыі.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Шукаюць вінаватых зусім ня там...

Бабруйскі гарвыканкам зрабіў афіцыйную заўвагу генэральнаму дырэктару Беларускага шыннага камбінату Аркадзю Палякову.

Паводле высновы гарвыканкамаўскіх чыноўнікаў, камбінат зьнізіў пастаўкі на экспарт сваёй прадукцыі. Па лічбах выходзіць менавіта так: паступленьні ад продажу на Захад прадукцыі камбінату зьнізіліся.

Але гэта выходзіць па адных лічбах, а па іншых, якія на паседжаньні прывёў гендырэктар, усё выглядае добра. Агульны *выпуск* прадукцыі вырас на 56 тыс. штук шынаў, а экспарт іх павялічыўся на 10%.

Аднак справа, як водзіцца, насамрэч ня ў лічбах. Бо ўзятыя паасобку яны адлюстроўваюць толькі настроі альбо намеры бакоў: у згаданым выпадку адчувальны пошук вінаватых за падзеньне «плянавых паказчыкаў». І пры гэтым хаваюць прычыны рэальнага стану справы. Ён у тым, што ў выніку палітыкі, якую праводзіць Беларусь – накіраванасьць выключна на Ўсход, самаізаляцыя ад Захаду, недэмакратычнасьць дзяржаўнага ладу – заходнія партнэры зварочваюць гандлёвыя й іншыя стасункі з нашай краінай. Вось сапраўдная прычына падзеньня за апошні час эканоміка-гандлёвых апэрацыяў ня толькі на бабруйскім шынным камбінаце, але і ў магілёўскім аб'яднаньні «Хімвалакно».

Сымон ГЛАЗШТЭЙН





У кнігарні магілёўскага згуртаваньня «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу» зьявіліся новыя Беларускія выданьні.

Выкшталцоная беларуская мова,
цудоўнае аздабленьне:
Лявон Юрэвіч. «Камэнтары»
Аляксандар Лукашук. «У фіялетавай ночы вугал крыла»
Адам Глёбус. «Новы дамавікамэрон»
Працяг сэрыі Архіва Найноўшае Гісторыі – «Антысавецкі рух у Беларусі 1944-1956» (даведнік)
Сяргей Дубавец. «Дзёньнік прыватнага чалавека»
Васіль Быкаў. «Сьцяна»
Даведкі па тэлефонах: 25-57-85 або 22-34-90.

Ці толькі драма абласнога драматычнага

180 мільярдаў рублёў патрабуецца будаўнікам і рэстаўратарам, каб старажытны будынак абласнога тэатра здолеў прыняць гледачоў.

Нагадаем, што тэатар рэстаўруецца ўжо амаль 10 гадоў. За гэты час клятвы ў тым, што тэатар з'яўляецца самым прыярытэтным аб'ектам, далі ўсе начальнікі: ад кіраўніка абласнога ўпраўленьня культуры да прэзыдэнта краіны. Але словы словамі, а справы справамі.

Справы-ж такія: дасюль будаўнікі здолелі толькі прыладзіць вакол тэатра некалькі новых прыбудоваў, а што тычыцца непасрэдна рэстаўрацыі – яна ўсё яшчэ наперадзе. Як вядома, менавіта гэтая частка капрамонту ёсьць найбольш дарагакаштоўнай. Па праграме фінансаваньня гэтага году выдаткоўваецца 20 мільярдаў рублёў. Па практыцы апошніх гадоў рэальна атрымаецца яшчэ меней. Практычна даўно абяцанага тэатральнага навасельля можна чакаць не раней за 2004 год.

Між тым нельга не ўзгадаць пра яшчэ адну будоўлю нашага горада. Пэўна чытач здагадаўся, што гаворка пойдзе пра спартовы «лядовы» палац ля ДК «Хімвалакно». На яго ўзьвядзеньне ўлада знайшла амаль у першачарговым парадку некалькі мільёнаў даляраў. Працы ідуць надта шпаркімі тэмпамі. Кажуць, што сам прэзыдэнт непасрэдна і пільна сочыць за будаўніцтвам палацу.

Зразумець прыярытэты ўлады можна, але дараваць іх – цяжка. На любімую прэзыдэнцкую забаву (няхай даруюць нам гэтае азначэньне сапраўдныя спартоўцы) сродкі знаходзяцца, а на аднаўленьне помніка культуры і гісторыі – ўвагі, зацікаўленасьці і грошай не хапае.

Ці не таму не хапае, што пры дыктатурах попытам карыстаецца здаровае цела, а не здаровы Дух...

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Першы крок

Чарговым новаўвядзеньнем на «фроньце» змаганьня ўлады з актывістамі кампаніі па выбарах прэзыдэнта адзначыўся магілёўскі дзяржаўны ўнівэрсытэт імя А.Куляшова.

Яшчэ падчас збору подпісаў за кандыдатаў у прэзыдэнты адміністрацыя гэтае паважанае ў горадзе навучальнае ўстановы пільна сачыла за тым, каб не супрацоўнікі й выхаванцы, не прывядзі Божа, не апынуліся пад «тлетворным» уплывам такіх асобаў, як спадары Пазьняк ды Чыгір. Дзеля забесьпячэньня «цнатлівасьці» і «парадку» ва ўнівэрсытэцкіх інтэрнатах быў узмоцнены працусны рэжым, а на выхавацеляў была ўскладзеная асабістая адказнасьць за «незаплямленасьць» студэнтаў.

Гэтым-жа разам на дапамогу працаўнікам інтэрнатаў былі кінутыя й куратары студэнтаў, што жывуць у вадпаведных інтэрнатах. Кожны зь іх (а гэта ці ня ўвесь выкладчыцкі склад) мусіць аддзяжураваць вызначаны тэрмін разам са студэнтамі і вахцёрамі на ўваходзе, аб чым засьведчыць запісам у спэцыяльным журнале. Правіламі дзяжурства пазначана, што ў выпадку зьяўленьня чалавека з выбарчай урнай, у лепшых савецкіх традыцыях 30-х гадоў, яго трэба зь ветлівай усьмешкай прапусьціць у інтэрнат – і неадкладна набраць нумар 02...

Адукаваныя й выхаваныя людзі, а зьбольшага такія ўваходзяць у склад выкладчыкаў унівэрсытэту, патрапілі ў няёмкую сытуацыю. Шмат хто зь іх ужо сам выказаўся за выбары, астатнія «непалітызаваныя» проста не жадаюць займацца паклёпам.

На жаль, ня ў стане пакуль гэтыя людзі адмовіцца ад выкананьня брудных справы, – нашае грамадзтва не сасьпела яшчэ да адкрытага пратэсту. Аднак сёньняшняя сытуацыя ў краіне далёка ня тая, што была яшчэ некалькі месяцаў таму. Аб гэтым можна меркаваць хаця-б па таму факту, што гэтую інфармацыю нашаму карэспандэнту паведамілі самі выкладчыкі ўнівэрсытэту. Тым самым зрабіўшы свой першы крок.

Аркадзь МЫШОЎ

Праграма тэлебачаньня з 17 мая па 23 мая

•• Понедельник, 17 мая ••

Праграму тэлеканалаў мы друкуем на замову чытачоў. Гаспадары праграмы падаюць нам яе на расейскай. Рэдакцыя фізычна (па часе) не пасьпявае яе перакласьці. Просім разглядаць гэтыя старонкі як тэхнічна-службовы матэрыял, які ня мае дачыненьня да зьместу й характару нашай газэты.

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.30 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 Телебарометр.
9.40 "Сегодня с вами..."
10.05 Здоровье.
10.30 Детский экран. "Я рисую".
10.45 Мультфильм.
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину".
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ.
13.10 Ю.Горобец в худ.фильме "Батька".
14.40 "Портрет на фоне замка". Док. фильм.
15.10 "Боишься ли ты темноты?"
15.35 "Будь готов?!"
16.15 ТВ — школе.
16.40 Авто-парк.
16.50 Премьера песни.
17.10 "А музыка звучит..."
17.30 "Солдатки". Док.фильм.
18.05 "Ветер в спину".
18.50 Новые имена.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.55 Л.Прыгунов, В.Заклунная в худ.фильме "Свадебные колокола".
23.50 Криминальная хроника.
23.55 Белорусский хит-парад.
0.00 Третий тайм.
0.40 "Рок-корона-98". Часть 1-я.

ОРТ

14.00, 17.00 Новости.
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 "Страшный, серый, лохматый". Мультфильм.
14.55 Звездный час.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.10 Программа "Мы".
18.50 Сериал "Сегун".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 "Горец-IV". "Герой поневоле".
21.45 Взгляд.
22.30 Однако.
22.45 Б.Андреев и В.Меркурьев в фильме "Повесть пламенных лет".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи". Телесериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.05 Вести.
15.15 "Музыка, музыка..."
15.30 "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 "Навстречу Тэфи." Дневник 5-й ежегодной Национальной телевизионной премии.
17.10 "Гомеопатия и здоровье".
17.20 С.Любшин и М.Вертинская в криминальной драме "Женщина в море".
18.30 "Да, господин министр". Телесериал.
19.40 Подробности.
19.50 "Любовь с первого взгляда".
20.25 А.Панкратов-Черный, Д.Харатьян, М.Кокшенов и М.Державин в музыкальной комедии "Новый Одеон".
21.45 Акуна матата.
22.50 "Дежурная часть".
23.35 "Автомотоспорт: летнее кольцо".

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 "Его я встретил в зоопарке". Худ. фильм.
8.30 Книжный кладезь.
8.45 "Под сенью дружных муз".
9.05 "Берега". Телесериал. 5-я серия.
10.10 Сцены из оперы П.И.Чайковского "Мазепа".
10.20 Театральная лимита.
11.15 Певица Е.Камбурова.
11.40 После новостей...
12.00 "Театр одного художника". Обри Бердслей.
12.20, 13.45 "А.С. Пушкин. Версия 1999". Спектакль Псковского академического театра им. А.С.Пушкина "И всюду страсти роковые..."
14.40 "Мы были". (Посвящается Я.Брюсу).
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 "Жены гениев". Передача 1-я.
16.05 "Легенды Большого".
17.00 Шалом.
17.40 "Вижу цель!"
18.05 Музыкальный экспромт.
18.20 "Я вспоминаю... Юлия Солнцева. Последнее интервью". Док. фильм.
19.15 Чудо-сказка.
19.50 "Видеопоэзия". Италия моя.
20.00 Л.Минкус. Балет "Баядерка". В постановке Мариинского театра.
20.45 После новостей...
21.05 "Берега". 5-я серия.
22.10 "Танцы на юбилей". Д.Эллингтон.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Солдаты удачи"(США).
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Вчера в "Итогах".
10.15 Куклы.
10.30 Итоги. Ночной разговор.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Угрюм-река".
13.30 "Арина".
14.20 "Сегоднячко". Красная стрела.
15.20 "Государственная граница". Фильм 3-й. 1-я серия.
16.40 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.00 Пунктир.
13.30 "Рандеву со звездой.Владимир Машков".
14.40 Телелоцман.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Школьный учитель".
18.20 "Том и Джерри".Мультфильм.
18.40 Бобруйский вариант.
19.00 Тяжелый день.
19.30 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Родная кровь".Худ.фильм.
23.00 День области.
23.10 "Вооружен и очень опасен".Детектив.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30, 21.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Белый попугай".
19.25 "Поздравления".
20.30 "В гостях у бабки Агапки".
20.43 Док. фильм.
21.10 Высокая мода.
21.40 Комедия "Ограбление по-французски".
23.10 Спортивная программа.

•• Вторник, 18 мая ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.00 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.35 "На волне взаимопонимания".
10.15 "Станция "Академия наук".
10.30 "Сегодня с вами..."
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину". Телесериал.
12.05 Третий тайм.
12.35 "А музыка звучит..."
13.10 Поэт Леонид Дранько-Майсюк.
13.30 "Рондо". Док.фильм.
13.55 Мультфильм.
14.05 Туробъектив.
14.25 Бездельник.
15.10 "Боишься ли ты темноты?"
15.35 ТВ — школе.
16.10 Музей жертв политических репрессий в Бобруйске.
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
17.35 Гости в дом. Шенгенский договор.
18.05 "Ветер в спину".
18.50 Новые имена.
19.15 "Алло, "Событие". Прямая линия.
19.55 Спортивные новости.
20.15 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ.фильм "Через кладбище".
23.20 Криминальная хроника.
23.25 Белорусский хит-парад.
23.30 Государственный концертный оркестр Беларуси под управлением Михаила Финберга.
0.10 Таиландский бокс. Международный турнир (Чехия).
0.30 "Рок-корона-98". Часть 2-я.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Во имя любви".
10.10 "Чехарда". Мультфильм.
10.15 Смехопанорама.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 Счастливый случай.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Тема.
18.50 Сериал "Сегун".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Е.Леонов в комедии "Зигзаг удачи".
22.25 Однако.
22.35 Док. детектив. "Дневник убийцы. Дело 1996 года".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.00 Короткометражные худ. фильмы.
10.00, 16.00, 19.00, 23.40 Вести.
15.15 "Музыка, музыка..."
15.30 "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 "Навстречу Тэфи.".
17.10 "Гомеопатия и здоровье".
17.15 "Дарю тебе звезду". Мультфильм.
17.30 Концерт, посвященный 350-летию Государственной противопожарной службы.
18.30 "Да, господин министр".
19.40 Подробности.
19.50 "Аншлаг" представляет.
20.25 Боевик "Команда "Тигров"(США).
22.20 "Урмас Отт с..."
23.25 "Дежурная часть".

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 Док. фильм.
8.20 А.С.Пушкин. "Руслан и Людмила".
9.05 "Берега". Телесериал. 6-я серия.
10.15 "Чужую жизнь играю как свою". В.Гафт.
11.00 "Вижу цель!"
11.40 После новостей...
12.00 Боярский двор.
12.30 М.Равель. Концерт для левой руки. Солист О.Майзенберг.
13.00 Безумные дни, или... Хроники рождения спектакля "Женитьба Фигаро".
13.45 Новое кино.
14.10 Ю.Томошевский читает стихи Н.Агнивцева из цикла "Королева и пажи".
14.20 "Российский курьер".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 "Строка из песни" из цикла "Истоки".
15.45 Скульптор Владимир Цигаль.
16.30 "Царская ложа".
17.10 Ортодокс.
17.40 "Ноу-хау".
17.55 Тихий вечер.
18.20 Ф.Мендельсон. Увертюра "Рюи Блаз".
18.30 "Документ-панорама".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 "Портреты в камне". "Жизнь за царя". Фильмы 1-й и 2-й.
20.45 После новостей...
21.05 "Берега". Телесериал. 6-я серия.
22.20 "Версия 1999". "Монологи о Пушкине".
22.35 "Из концертного зала".

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Герой дня без галстука.
9.40 "Чистосердечное признание".
10.05 Своя игра.
10.30 Дог-шоу "Я и моя собака".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Угрюм-река".
13.30 "Детектив Нэш Бриджес" (США).
14.20 "Сегоднячко".
15.25 "Государственная граница". Фильм 3-й. 2-я серия.
16.40 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.05 Тяжелый день.
14.30 Бобруйский вариант.
14.50 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Школьный учитель".
18.20 Катастрофы.
19.00 Служба ваших забот."Хозяйское отношение к земле".
19.40 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Старики - разбойники".Комедия.
23.05 День области.
23.15 "Сияние".Триллер.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Удивительные истории".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 Док. фильм.
21.10 "Вясёлка Магілёўшчыны".
21.30 Высокая мода.
21.40 "Деньги". Худ. фильм.
23.25 Спортивная программа.

•• Среда, 19 мая ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.05 Новости.
8.00 "Алло, "Событие".
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
10.15 "Навстречу".
11.10 Новые имена.
11.20, 18.05 "Ветер в спину".
12.05 Око.
12.25 Зорная ростань.
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь".
15.10 "Боишься ли ты темноты?"
15.35 "Маэстро". Телеочерк .
16.05 "5x5".
16.35 Учебные юридические заведения г.Минска.
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 "Судьба моя и надежда".
18.50 Новые имена.
19.15 "Сегодня с вами..."
19.40 Спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ. фильм "Цена сокровищ".
23.25 Криминальная хроника.
23.30 Белорусский хит-парад.
23.35 Королевская охота.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15, 16.00 "Во имя любви".
9.15 Тема.
9.55 "Жадный Кузя". Мультфильм.
10.10 В мире животных.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 Классная компания.
15.00 Зов джунглей.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
17.15 Маски - шоу.
17.45 Здесь и сейчас.
18.10 Человек и закон.
18.50 Сериал "Сегун".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Подлинная история Е.Фурцевой в программе "Серебряный шар".
21.40 Футбол. Кубок кубков. Финал. "Лацио" (Италия) — "Мальорка" (Испания). 22.40 Однако.

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.05 "Миледи". Телесериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.25 Вести.
15.15 "Музыка, музыка..."
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 Футбол. Товарищеский матч. Сборная России — сборная Беларуси.
19.40 Подробности.
19.50 Сам себе режиссер.
20.25 Комедия "Остин Пауэрс — международный человек-загадка".
22.10 "Площадь звезд-99".
23.10 "Дежурная часть".
23.55 Автошоу.

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Берега". Телесериал. 7-я серия.
10.15 Зинаида Гиппиус. Часть 1-я.
10.45 "Документ-панорама".
11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
11.40 После новостей...
12.00 "Образы античности".
13.10 Время, портреты, судьбы.
13.45 Несколько этюдов о русском языке.
14.05, 15.30 К.Сен-Санс. Опера "Самсон и Далила".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
17.00 Экспедиция "Чиж".
17.40 "Кто мы?" "Русская идея".
18.25 "Документ-панорама".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Осип Мандельштам.
20.10 Концерт Н.Луганского.
20.45 После новостей...
21.05 "Берега". Телесериал. 7-я серия.
22.10 Андрей Битов.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Х/ф "Парень из нашего города".
10.40 "Среда".
11.25 Худ. фильм "Юг" (Испания).
13.30 "Детектив Нэш Бриджес".
14.15 Телеигра "Пойми меня".
14.45 Мультфильм.
15.30 "Государственная граница".
16.40 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.25 "Хозяйское отношение к земле".

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Ток-шоу"Мужской клуб".
18.25 ДАО.
18.45 Ток-шоу"Лестница".
19.25 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "На волосок от смерти".Боевик.
23.05 День области.
23.15 Спорт планеты.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30, 21.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Случайный свидетель".
19.25 "Поздравления".
20.30 "В гостях у бабки Агапки".
20.43 "Пляж".
21.40 Триллер "Психушка".
23.05 Спортивная программа.

•• Четверг, 20 мая ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.10 Королевская охота.
9.40 Мультфильм.
9.55 "Вас вызывает Спортландия".
11.10 Новые имена.
11.20, 18.05 "Ветер в спину".
12.05 "Беларусь в зеркале мемуаров". Адам Мальдис.
12.25 "А музыка звучит..."
13.10 А.П.Чехов."Чайка".Спектакль.
14.25 Телевизионный Дом кино.
15.15 "Боишься ли ты темноты?"
15.40 ТВ — школе.
16.10 "Поэзия красок". Телеочерк.
16.30 Гости в дом. Шенгенский договор.
17.10 "Крево". Док.фильм.
17.30 Усадьба.
17.55 "Пасть пропасти". Видеофильм.
18.50 Новые имена.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.55 "Свободное время и молодежь".
22.40 Белорусский хит-парад.
22.50 Худ.фильм "Живая плоть" .
0.30 Криминальная хроника.
0.45 Акколада.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.

8.15, 16.00 "Во имя любви".
9.15 Человек и закон.
10.05 Клуб путешественников.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 Волшебный мир, или Синема.
15.00 Улица Сезам.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.10 Р.Карцев в программе Э.Рязанова.
18.50 Сериал "Сегун".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Худ. фильм "Эйр Америка".
22.45 Однако.
22.55 "Экстренный вызов".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи". Телесериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.30 Вести.
15.15 "Музыка, музыка..."
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 "Навстречу Тэфи."
17.10 "Гомеопатия и здоровье".
17.15 Драма "С вечера до полудня". 1-я серия.
18.30 "Да, господин министр".
19.40 Подробности.
19.50 "Два рояля".
20.40 Мелодрама "Продлись, продлись, очарованье..."
22.20 "Великая гражданская на Балканах. Продолжение".
23.15 "Дежурная часть".

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
9.00 "Хевсурская баллада". Худ. фильм.
10.25 Зинаида Гиппиус. Часть 2-я.
10.55 "Грот в Кускове".
11.40 После новостей...
12.00 "Образы Возрождения".
13.15 Гончар из деревни Располово.
13.45 Ваше сословие.
14.10 Поклонникам Терпсихоры.
14.30 Страна Фестивалия.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 "Жены гениев". Передача 2-я.
16.00 "С потолка".
16.25 "Орни-99" с Ириной Архиповой.
17.05 "Игры полицейских". Док. фильм.
17.40 Новое кино.
18.05 "Российский курьер".
18.45 "Время музыки".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Осенние портреты.
20.15 "Танго в Кремле". Г.Кремер.
20.45 После новостей...
21.05 "Хевсурская баллада". Худ. фильм.
22.30 Джазофрения.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Комедия "Девушка без адреса".
10.45 Мультфильм.
11.30 Худ. фильм. "Угрюм-река".
13.30 "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 "Сегодняшко".
15.20 "Государственная граница".
16.40 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Ток-шоу "Я сама".
18.35 Из жизни женщин.
19.00 "Пугало". Мультфильм.
19.10, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30, 22.50 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Крепкий орешек". Комедия.
23.00 "Почтальон всегда звонит дважды". Драма.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.50 Прогноз погоды.
19.00 "Арест и воля".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильмы.
20.53 Док. фильм.
21.25 Высокая мода.
21.30 Драма "Спаситель".
23.00 Спортивная программа.

•• Пятница, 21 мая ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.45 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Мульфильмы.
10.05 Уроки Н.Новожиловой.
10.30 Усадьба.
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину".
12.05 Уникальные операции белорусских медиков.
12.25 Бон тон.
13.15 А.П.Чехов. "Чайка". Спектакль. Часть 2-я.
14.25 "Голубка моя". Телеочерк.
14.45 "Галерея". Док.фильм.
15.10 "Боишься ли ты темноты?"
15.35 Судьба моя и надежда.
16.00 Регион. Передача из Гомеля.
16.25 "Риск-версия". Телеигра.
17.15 "А музыка звучит..."
17.35 "Беларусь в зеркале мемуаров". Адам Мальдис.
18.05 "Ветер в спину".
18.50 Новые имена.
19.15 "Сегодня с вами..." Художественный руководитель Государственного ансамбля танца РБ В.Дудкевич.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ. фильм "Время танцора" (Россия).
0.55 Криминальная хроника.
1.00 Белорусский хит-парад.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Во имя любви".
9.15 Программа "Мы".
10.00 Роман Карцев в программе Эльдара Рязанова.
10.40 Смак.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Питер Фальк в фильме-сказке "Принцесса-невеста".
16.00 "Во имя любви".
17.15 Джентльмен-шоу.
17.45 Играй, гармонь любимая!
18.15 Здоровье.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Коломбо в фильме "План убийства".
22.10 "Жизнь замечательных людей". Борис Васильев.
22.40 Тема недели.
23.00 Фантастический боевик "Темная планета".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи". Телесериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.25 Вести.
15.15 "Музыка, музыка..."
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 Башня.
16.55 "Навстречу Тэфи."
17.10 "Гомеопатия и здоровье".
17.15 Кинодрама "С вечера до полудня". 2-я серия.
18.30 "Да, господин министр".
19.40 Подробности.
19.50 "Аншлаг" и К°.
20.55 Музыкальный ринг.
22.35 Подиум д'арт.
23.10 "Дежурная часть".

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 Новодевичий монастырь.
7.55 Скульптор Владимир Цигаль.
8.40 Консилиум.
9.05 О.Аросева... и другие.
10.05 Произведения Ф.Листа и Ф.Шуберта исполняет В.Виардо.
10.20 Зинаида Гиппиус. Часть 3-я.
10.50 Российский курьер.
11.40 После новостей...
12.00 "Образы титанов".
13.10 "Видеопоэзия". Е.Баратынский.
13.45 "Кто там..."
14.10 А.Скрябин. "Поэма экстаза".
14.30 "Что нас волнует больше вина". Б.Васильев.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 "Время музыки".
15.55 Фантазеры.
16.40 "Встречи на Пикрис-горе". Авторская программа С.Чиаурели и К.Махарадзе. Передача 1-я.
17.40 Страна Фестивалия.
18.05 Очевидное-невероятное. Век XXI.
18.35 "Бриллианты мирового балета".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Художник Владимир Мухин.
20.05 "Джаз. Тема с вариациями". Г.Гаранян.
20.45 После новостей...
21.05 Фильм Д.У.Гриффита "Нетерпимость". Часть 1-я.
22.00 Д.Хворостовский в театре "Новая опера".
22.30 Осел и соловей.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Худ. фильм "Мафия бессмертна".
10.45 Мультфильм.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Угрюм-река".
13.30 "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.25 "Государственная граница". Фильм 5-й. 1-я серия.
16.40 Впрок.
16.55 Футбольный клуб.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Очевидец". Док.сериал.
18.05 "Полиция Лос-Анджелеса".
18.45 "Том и Джерри". Мультфильм.
19.00 В мире эллипсов.
19.40 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 Пунктир.
21.00 Астро-дайджест.
21.10 Праздник в вашем доме.
21.45 Футбол. "Днепр-Трансмаш" — "Свислочь-Кровля" (Осиповичи).
23.25 День области.
23.35 "Рубин Каира". Приключения.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30, 21.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Альфред Хичкок представляет".
19.25 "Поздравления".
20.30 "В гостях у Бабки Агапки".
20.43 Музыкальная коллекция.
21.40 Боевик "Герой-одиночка".
23.30 Музыкальная коллекция.

•• Суббота, 22 мая ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "Утоли мои печали". Док. фильм.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 Сказка за сказкой. Мультфильмы.
9.35 Родное слово.
10.05 "Сегодня с вами..."
10.30 Здоровье.
10.55 Вершина мира.
11.20 Компьютерный полигон.
11.45 "Все нормально, мама!"
12.20 Спортивные новости.
12.40 Усадьба.
13.05 Новые имена.
13.15 "Династия-2. Семья Колби".
14.00 "Поставские хозяева". Телеочерк.
14.25 Олимп.
15.10 Уроки Н.Новожиловой.
15.35 Познай себя. Дайджест.
15.55 Гандбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Беларусь — Греция.
16.35 Мультфильм.
17.30 Ток-шоу "Это моя работа".
17.55 Балетная миниатюра.
18.10 КВН. 1/8 финала Международной Евролиги.
19.40 Из достоверных источников.
20.00 Новые имена.
20.05 Бездельник.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Драма "Кровавые деньги" (США).
23.15 Белорусский хит-парад.
23.30 Видимо-невидимо.

ОРТ

6.55 Боевик "Под маской беркута".
8.25 Слово пастыря.
8.45 Домашняя библиотека.
9.00, 14.00, 16.55 Новости.
9.15 Программа "100%".
9.45 "Утренняя почта".
10.20 "Каламбур".
10.50 Смак.
11.10 Возвращение Третьяковки.
11.20 "Экстренный вызов".
11.55 Худ. фильм "Цыган".
13.20 В мире животных.
14.15 "Цивилизация".
14.45 Умницы и умники.
15.15 Как это было. "Поджог Бородинской панорамы". 1967 год.
15.55 Чемпионат России по футболу. ЦСКА — "Ротор" (Волгоград).
17.55 "Ералаш".
18.10 Комедия "Жандарм в Нью-Йорке".
20.00 Время.
20.50 Сериал "Секретные материалы".
22.30 Новости спорта.
22.50 "Золотая пальмовая ветвь" Каннского фестиваля. Фильм "Подполье". (Югославия, 1995 г.).

"РОССИЯ"

7.00 "Шайлох". Худ. фильм для детей.
8.30 Мультфильмы.
9.00 Доброе утро, страна.
9.30 Сам себе режиссер.
10.00 "Сто к одному". Телеигра.
10.45 "Любовь с первого взгляда".
11.15 "Золотой ключ".
11.30 "Домашние хлопоты".
12.05 "Тарзан. История приключений". "Тарзан и королева леопардов".
13.00, 19.00 Вести.
13.30 Неделя власти.
14.00 "На здоровье." Ток-шоу.
15.05 "Закон и порядок".
16.00 Совершенно секретно.
17.00 Моя семья.
18.00 Старая квартира. Год 1965.
19.35 О.Газманов на "Площади звезд".
21.45 "Навстречу Тэфи."
22.00 Худ. фильм. "Живая плоть".
23.45 Горячая десятка.

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 Книжный кладезь.
9.35 "Насреддин в Бухаре". Худ. фильм.
11.05 "Мировая деревня".
11.35 "Наперстянка". Док. фильм.
12.05 "Большой хоровой собор у стен Храма Христа Спасителя".
12.50 Мультфильм.
13.00, 13.45 "Он был забавным". Л.Оливье.
13.30, 21.00 Новости культуры.
14.15 "Русская исполнительская школа XXI века". Передача 1-я.
14.55 "Семь чудес света". Фильм 1-й.
15.50 А.Баталов. "Профессия и ремесло".
16.20 "Ракурс памяти". О.Берейский.
16.30 "Судьба, судьбою, о судьбе".
17.30 Новости.
17.35 А.С.Пушкин. "Борис Годунов". Телеспектакль.
19.05 Чудо-сказка.
19.20 15-й подъезд.
19.45 "Субботний вечер с..." Шарль Азнавур.
20.05 "Нетерпимость". Часть 2-я.
20.35 "Дом актера". Традиции дома.
21.25 Блеф-клуб.
22.00 Музыкальный антракт.

НТВ

7.00 Сегодня.
7.15 Худ. фильм "Учитель пения".
8.40 "Фитиль".
9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Криминал.
9.40 Впрок.
9.55 "Миго — инопланетянин".
10.25 Телеигра "Пойми меня".
11.15 Профессия — репортер.
11.30 Своя игра.
12.00 Муз. фильм "Сильва". 1-я и 2-я серии.
14.30 Программа М.Таратуты.
15.15 "Она написала убийство".
16.10 Суд идет.
17.00 Дог-шоу "Я и моя собака".

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Потрясающие приключения мушкетеров". Мультфильм.
18.45 С любовью.
20.20 Телемагазин.
20.30 "Парижские тайны". Мелодрама.
22.15 Астро-дайджест.
22.25 Телелоцман.
22.50 Диск-канал.
23.20 "Сказка вампира". Ужасы.

2 КАНАЛ

15.00 "Три ветерана". Фильм — детям.
16.25 Муз. антракт.
16.30 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 "Благая весть с Риком Реннером".
18.30 "Поздравления".
19.30 Индийское кино "Я вас люблю".
21.50 Высокая мода.
22.00 Боевик "Трудная мишень".
23.35 Спортивная программа.

•• Воскресенье, 23 мая ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Конный спорт. Этап Кубка мира, выездка.
8.30 Мультфильм.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 "Я рисую".
9.25 Юный скрипач Олег Яцына.
10.05 Мультфильм.
10.15 Туробъектив.
10.40 "Все нормально, мама!"
11.15 Белорусский дом.
11.45 Арсенал.
12.10 Международные спортивные новости.
12.30 Сделано в Беларуси.
12.45 Телевизионный Дом кино.
13.15 Новые имена.
13.25 "Династия-2. Семья Колби".
14.10 Сельчане. Узденский район.
14.35 "Виктор Кульбаченко. Эверест: хроника восхождения". Видеофильм.
15.15 Ток-шоу "Это - XXI".
16.00 "Зорная ростань".
16.30 Телебарометр.
16.45 В.Ильин в худ.фильме "Свистун" (Германия—США—Россия).
18.15 Творческий вечер заслуженного артиста Беларуси Алексея Исаева.
18.55 Новые имена.
19.00 Теленавигатор.
19.20 Стадион.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Ток-шоу "Карамболь" с участием актрисы Ирины Розановой.
21.25 Худ.фильм "Бесы" (Франция).
23.25 Премьера песни.
23.35 Авто-парк.
23.45 Парусный спорт. Международная регата.
0.15 Лика Ялинская в программе "Новая коллекция".

ОРТ

7.00 Л.Куравлев в фильме "Жизнь и удивительные приключения Робинзона Крузо".
8.30 "Дисней-клуб": "Русалочка".
9.00, 14.00 Новости.
9.15 "Непутевые заметки".
9.30 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
11.00 Служу России!
11.30 Играй, гармонь любимая!
12.00 Крестьянские ведомости.
12.30 "Все путешествия команды Кусто".
13.25 Смехопанорама.
14.15 Клуб путешественников.
15.05 Футбольное обозрение.
15.35 "Дисней-клуб": "Тимон и Пумба".
16.00 "Дисней-клуб": "Аладдин".
16.35 "Колесо истории".
17.25 Л.Гузеева и Н.Михалков в фильме "Жестокий романс". 1-я и 2-я серии.
20.00 Время.
20.35 КВН-99.
22.40 Итоги Каннского фестиваля в программе "Тихий дом".
23.10 Новости культуры.
23.30 Ален Делон в фильме "Первая ночь покоя".

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильмы.
7.30 "Служу Отечеству."
8.00 "Сельские вести".
8.30 "Почта РТР".
9.00 Доброе утро, страна.
9.30 "Устами младенца". Телеигра.
10.00 "Аншлаг" и К°.
11.00 Русское лото.
11.40 Мир книг.
11.55 Мультфильм.
12.05 "Тарзан. История приключений". "Тарзан и потерянный легион".
13.00 Вести.
13.30 Федерация.
14.10 Парламентский час.
15.10 "Закон и порядок".
16.00 Диалоги о животных.
17.00 "Слоненок-турист". Мультфильм.
17.10 Ш.Стоун в мелодраме "Слезы под дождем" (США).
19.00 Зеркало.
19.55 Полина Кутепова в трагикомедии "Орел и решка".
21.35 "Навстречу Тэфи."
21.50 В.Высоцкий в программе "Фрак народа".
22.50 "Дежурная часть".
23.20 Лауреат Каннского фестиваля. Культовый фильм Матье Кассовича "Ненависть" (Франция).

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 "Чародейки из предместья". Худ. фильм.
10.40 Консилиум.
11.10 Ковчег.
11.35 "Порошок и лист". Док. фильм.
12.05 "Спортивные встречи". М.Мамиашвили.
12.35 БДТ: вчера, сегодня, завтра.
13.30, 21.25 Новости культуры.
13.45 Мультфильм.
14.00 "Русская исполнительская школа XXI века". Передача 2-я.
14.55 "Семь чудес света". Фильм 2-й.
15.35 Про фото.
16.00 "Судьба, судьбою, о судьбе".
17.30 Новости.
17.35 Маргит.
18.00 П.И.Чайковский. "Евгений Онегин". Опера в постановке московского академического музыкального театра им. К.С. Станиславского и В.И. Немировича-Данченко.
21.45 "Кумиры". Давид Карасик.
22.10 Фильм Д.У. Гриффита "Нетерпимость". Часть 3-я.

НТВ

7.00 Сегодня.
7.15 Н.Алисова и А.Кторов в фильме "Бесприданница".
8.40 "Фитиль".
9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Дик Дайк в фильме "Призрачный шанс" (США).
11.25 Большие деньги.
11.55 Кто прав?
12.25 И.Чурикова и Л.Куравлев в фильме "Начало".
14.05 "Арина".
15.30 Профессия — репортер.
15.45 "Она написала убийство".
16.35 "Неизвестная война". Фильм 2-й. "Битва за Москву" (СССР — США).


2 КАНАЛ

15.00 "Геркулес". Мультфильм.
16.25 Муз. антракт.
16.35 "Шестнадцатилетние".
17.00 "Поздравления".
18.00 Джойс Майер. "Жизнь в слове".
18.30 Мультфильмы.
19.00 "1/52".
19.10 Муз. антракт.
19.25 Док. фильм.
19.50 "Секретные материалы".
20.35 Мультфильм.
20.40 "Иллюзия убийства".
21.25 Высокая мода.
21.30 Мелодрама "На всю катушку".
23.40 Спортивная программа.

СЛОВА ПРА СТАРАВОЙТАВА

Для гэтай улады дробязей не існуе

Улада, якая, відаць, нацешылася прыніжэньнем Васіля Старавойтава, нарэшце гатовая вынесьці яму прысуд: 5 гадоў пазбаўленьня волі, зразумела, з канфіскацыяй маёмасьці. Мяркуецца, што гэта адбудзецца ў Кіраўску заўтра.



... Гэтыя нататкі ня маюць мэты паўтарыць услед за сьледствам наяўнасьць «складу злачынства» альбо, у выніку свайго расьсьледваньня, засьведчыць яго адсутнасьць. Любы дырэктар у нашай «эканамічнай» сыстэме ходзіць па мінным полі крыміналу, дзе мала значэньня мае тое, «паклаў ці не» ён што-небудзь у сваю непасрэдную кішэню. Для ўлады вартасна іншае: ці не прынесены ў выніку дзеяньняў дырэктара ўрон дзяржаве. А вызначае гэта, дарэчы, яна сама, – тут спрачацца цяжка (у поўнай меры гэта адчула на сабе старавойтаўская абаронца Вера Страмкоўская, над якой за стараньне зараз вісіць пагроза крымінальнай справы супраць яе самой).

Мае нататкі пра іншае. Яны ёсьць спробай адказаць (найперш сабе) на пытаньне, якое не дае супакою і хвалюе. Як магло здарыцца *такое* зь ім, Васілём Старавойтавым, і ці здарылася яно ўвогуле?

Здарылася – чалавек, які зусім нядаўна быў гонарам нацыі і прыкладам для ўсяго ранейшага Саюза, апынуўся за кратамі па банальным крымінальным абвінавачваньні. У ***нармальным*** грамадзтве такое здарэньне ня можа не пасеяць расчараваньня, ня можа пакінуць людзей душэўна спакойнымі, бо гэта – абраза грамадзкай маралі і ўрон грамадзкаму сумленьню: альбо раней нас усіх падманвалі, альбо падманваюць зараз.

На жаль, такога настрою ў грамадзтве ня бачна: у кожнага хапае сваіх клопатаў, каб яшчэ адцягваць увагу да нейкага, хай сабе і зь вядомым прозьвішчам, «злачынцы», тым больш, што менавіта такую пазыцыю занялі афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі. Аднак Старавойтаў – зусім ня «нейкі» і таму, на маё перакананьне, зусім невыпадковы, а лягічны аб'ект нападу на сябе з боку цяперашняй улады.

Вернемся крыху назад: у 1968-м годзе дырэктар клімавіцкага саўгаса «Раднянскі», 44-гадовы Герой сацыялістычнай працы Васіль Старавойтаў па загаду партыі, як тады рабілася ўсё, «выбіраецца» старшынём знакамітага «Рассвета», каб захаваць і памножыць славу гэтай славутай гаспадаркі пасьля таго, як памёр ейны кіраўнік Кірыла Арлоўскі. Як употай прызнаваўся пазьней журналістам Старавойтаў, не хацелася яму перабірацца на новае месца. Найбольш насьцярожвала тое, пра што ведалі ўсе, хто меў дачыненьне да сельскай гаспадаркі: у «Рассвете» ўсё трымалася на пастаянным спрыяньні калгасу ня толькі з боку мясцовага партыйнага і савецкага кіраўніцтва, але й саюзных і рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў. А сама гаспадарка трымалася на жалезнай дысцыпліне і страху пакараньня, на поўнай залежнасьці людзей ад характару і настрою колішняга «чырвонага баявіка», які і калгасам камандаваў нібы атрадам у ваенны час... Гэтыя «складаемыя посьпеху» маглі абваліцца ў вадзін момант, а адказваць давядзецца новаму старшыні. Тым больш, што Васіль Старавойтаў быў іншым: ахвотней пераконваў людзей, чым загадваў ім, ахвотней хваліў, чым караў. Урокі ня надта гераічнага, але рэальнага партызанскага жыцьця, партработа ў спустошанай пасьляваеннай вёсцы, і нарэшце саўгаснае дырэктарства зрабілі на ім той адбітак, што служэньне людзям – пры ўсім савецкім фарысэйстве гэтай задачы – сапраўды сталася мэтай ягонага жыцьця.

Напачатку, па інэрцыі, ды і потым, пад уласны аўтарытэт, рознае начальства спрыяла і яму. Алеж спрыяньне гэтае Васіль Старавойтаў «выкарыстоўваў» у зусім іншых мэтах – для таго, каб атрымліваць дазвол на тое, што іншым калгасам забаранялася: на самастойнасьць у вядзеньні гаспадаркі, на ўкараненьне новых тэхналёгіяў і формаў арганізацыі, на сыстэму аплаты працы і заахвочваньня, заснаваную на выніках працы, а не на нормах, абавязацельствах і прыслужніцтве. Калгас заставаўся калгасам, але старавойтаўская ўпартасьць, хітрасьць, працаздольнасьць, гаспадарчы разьлік і самастойнасьць зрабілі сваю справу. Даволі хутка «Рассвет» перастаў быць сацыялістычнай іконай, а стаўся гаспадаркай, якая давала разнастайнай прадукцыі больш, чым увесь раён.

Найперш выйгралі людзі: працаваць у калгас – па спэцыяльнасьці! – быў запрошаны архітэктар, на «кальцавой» калгаснай дарозе, што зь любой вёсачкі выводзіла на аўтатрасу і райцэнтар, зьявіўся асфальт, штогод большала мясцовых прыватных машын, гаспадарка ўзяла на сябе праз шматлікія «службы сэрвісу» многія турботныя і амаль не вырашальныя ў звычайных вясковых умовах пабытовыя клопаты. Заробкі рассветаўцаў уражвалі кожнага, хто пра іх даведваўся. На прыём у калгас (а пазьней у Акцыянэрнае таварыства) існавала чарга і праводзіўся конкурс. На якія б пленумы, нарады і сэсіі не запрашалі Васіля Старавойтава (калі было немагчыма адмовіцца, ён езьдзіў) – тэма ягоных выступаў заўсёды была адна: колькі рэальна атрымалі за папярэдні пэрыяд калгасьнікі (па відах работаў, па кожнай калгаснай галіне) і колькі яны атрымаюць у бліжэйшы час. Прозьвішчы сваіх людзей, вынікі іхняй працы, плянуемыя дасягненьні і ўсе іншыя лічбы ён трымаў у памяці і ніколі не глядзеў у загадзя падрыхтаваную паперу, у якой «для пратаколу» значылася: ...выконваючы рашэньні 22 зьезда КПСС ... ідучы насустрач... ставячы задачу датэрміновага ...

Яму зайздросьцілі – нават гэтаму «праву» не прамаўляць такіх слоў (многія ўмелі толькі гэта і на тым трымаліся), узроўню рассветаўскага жыцьця і вядомасьці, славе (другую Зорку героя старшыні «Рассвета» ўручылі ў 84-м), саюзнаму дэпутацтву і дэлегацтву. Не было такога абласнога партначальніка (магчыма, акрамя Лявонава), які б не імкнуўся «на Старавойтаве» зарабіць тое-ж і для сябе, а калі не атрымвалася – затойваў крыўду на рассветаўскага старшыню.

Таксама паводзілі сябе многія калегі, якім хацелася быць Старавойтавымі, але не ўдавалася. Яны не разумелі, што для таго, каб быць Старавойтавым, трэба найперш не баяцца на вёсцы нічога новага, асабліва з таго, што ёсьць «добра забытае старое»: уласнасьці і выгоды. Трэба, не паглядаючы на чарговую дырэктыву, кіравацца ва ўсім здаровым сэнсам. Інакш гаворачы, трэба весьці справу «па-капіталістычнаму». (Між іншым, варта было б перайменаваць Зорку працоўнага героя, бо ўсе, хто атрымалі яе не за «палітыку», дамагліся прызнаньня менавіта за тое, што парушалі сацыялістычную тэорыю і практыку). І трэба, зразумела, працаваць ад сьвятла да сьвятла, але не для «дэманстрацыі», а дзеля дабрабыту і пэрспэктывы. На жаль, для большасьці старшыняў калгасаў гэта катэгарычна не падыходзіла і не падыходзіць: іх вучылі па-іншаму і былі яны на гэтых уроках «сацыялізму» першымі вучнямі, іх вучаць па-іншаму зараз – яны зноў выдатнікі. Гэта праявілася яшчэ падчас гарбачоўскай спробы хаця-б у нечым «палепшыць» савецка-саюзную сыстэму. Сярод самых трывалых абаронцаў «папярэдніх заваёваў» былі (і застаюцца) старшыні калгасаў.

А Васіль Старавойтаў, як заўсёды, адкрыта пацягнуўся да новага, паверыў новаму і ўчапіўся ў яго. Хутка ў «Рассвете» зьявіліся (зь ліку сваіх-жа калгасьнікаў) арэндатары – рэальныя ўладальнікі рэальнай (былой калгаснай) маёмасьці. Ім спатрэбіўся і быў утвораны свой сапраўдны банк. Самастойнымі адзінкамі гаспадараньня сталіся ўчорашнія калгасныя «падсобкі» – завод напіткаў, каўбасны цэх, мэблевая фабрыка. У сталіцы адчынілася рассветаўская фірмовая крама, дзе кошты ўстанаўліваліся не дырэктыўнымі ўказаньнямі і «клопатам пра народ», а рынкавым попытам і вытворчым прыбыткам. Нікому звонку стала зусім немагчыма камандаваць гаспадаркай, даць ёй даручэньне, загадаць, што рабіць, за якую цану і каму «адгрузіць» прадукцыю. Страцілі для рассветаўцаў сваю колішнюю вартасьць і розныя «нормы выпрацоўкі», «пляны продажу прадукцыі», паказчык «прадукцыйнасьці калектыўнай працы», «дзяржаўная цэнавая палітыка» на прадукцыю сельскагаспадарчай вытворчасьці. Некуды зьнікла, з-за непатрэбы ў ёй, «ідэалягічная выхаваўчая работа зь людзьмі»...

Ад такога гаспадарчага вальнадумства адзін крок – да вальнадумства ***палітычнага***. Калі такія людзі, як Старавойтаў, да нечага, як гаворыцца, даходзяць – праз досьвед, душэўныя сумненьні і шчыры пакутны роздум – завярнуць назад іх немагчыма. Паспытаўшы эканамічнай свабоды, адчуўшы яе маральную прыцягальнасьць, Васіль Старавойтаў – нядаўна яшчэ пераканаы камуніст – пачаў задумвацца над свабодамі іншымі, безь якіх не бывае вольнага гаспадараньня.

Не аднаму мне даводзілася чуць ягоныя меркаваньні наконт «правільнасьці сувэрэнітэту», разумнасьці многіх палажэньняў народна-франтаўскай палітычнай праграмы, не гаворачы пра праграмы больш «стрыманых» дэмакратычных партыяў. Давялося чуць далёка не прыхільныя выказваньні аб калгаснай сыстэме. Дадайце сюды рэальную працу над тым, каб зламаць гэтую сыстэму ў сябе і рассветаўскіх людзях. Зьвяжыце гэта са «змовай» зь міністрам сельскай гаспадаркі Лявонавым, што падзяляў і падтрымваў гэткі настрой...

Дробязі?.. Не для ***гэтай*** улады.

Вось чаго, здаецца, насамрэч не даравала ўлада Старавойтаву і чаго спалохалася – таго, што двойчы Герой сацыялістычнай працы, знакаміты старшыня, папулярны чалавек адкрыта прыйдзе да нацыянальнай беларускай ідэі. Гэта трэба было папярэдзіць, гэта трэба было спыніць. Палітычных працэсаў у нас няма. Згадзіўся крымінальны...

Між тым, на мой погляд, папярэдняя ўлада Старавойтава ўпусьціла, а цяперашняя спазьнілася. Да нацыянальнай ідэі Васіль Старавойтаў ішоў увесь свой сьвядомы шлях: да забеспячэньня магчымасьці і права працаваць на роднай зямлі – вольна, без прымусу і з выгадай. Для сябе, дзяцей і ўнукаў. І для нас з вамі, канешне. І для краіны таксама...

Ці-ж гэта ня ёсьць беларускай ідэяй і марай?!

Генадзь СУДНІК

P.S. Заўтра ў Кіраўску прагучыць прысуд. Справа для 75-гадовага пакутніка скончыцца, закрыецца. Па меншай меры на гэтым этапе часу. Рашэньне суда аб Васілі Старавойтаве можа быць перагледжана, як вядома, толькі іншым судом. Фармальным ці, як гаворыцца, судом гісторыі – гэта ўжо як лёс распарадзіцца...

Крушэньне веры й надзей



Беларускі варыянт: так заўсёды заканчваецца шлях у нікуды (гэты й іншыя здымкі нумара - IREX)

На розных мовах

«Народная воля» напрыканцы сакавіка надрукавала Заяву, падпісаную кіраўнікамі шмат якіх грамадзкіх аб'яднаньняў з усіх рэгіёнаў краіны, у якой адзначаўся недэмакратычны характар на той час маючых адбыцца выбараў у мясцовыя саветы. Пракуратура ўгледзела ў гэтай заяве заклік да байкоту выбараў і распачала адпаведнае расьсьледаваньне (цікава, няўжо пракуроры выступаюць за ўдзел у антыдэмакратычных выбарах?).

Сьледчыя пракуратуры, адклаўшы ўбок крымінальныя справы, пачалі выклікаць на допыты падпісантаў Заявы. Характэрна, што вопытныя сьледчыя за гэтую гіблую справу не бяруцца, перадаюць яе пачаткоўцам. А тыя шчыруюць, як умеюць. Аб адным з такіх эпізодаў і пойдзе гаворка ніжэй.

Сьледчы пракуратуры Цэнтральнага раёна г.Магілёва Зьміцер Краўчанка запрасіў позвай для тлумачэньняў кіраўніка Магілёўскай філіі БСДГ Міхася Булавацкага. Той прыйшоў з сваім прадстаўніком Сяргеем Абадоўскім (***увага! артыкул 62 Канстытуцыі дазваляе ў зносінах з праваахоўнымі і іншымі дзяржаўнымі органамі карыстацца паслугамі свайго прадстаўніка, у якасьці якога можа выступаць любы чалавек; пра гэта грамадзянам трэба ведаць***). Сьледчы паспрабаваў не дапусьціць удзелу прадстаўніка ў размове, спасылаючыся на працэсуальны кодэкс, але тэкст артыкула з Канстытуцыі прымусіў яго пагадзіцца.

Другой нечаканасьцю для сьледчага было патрабаваньне «сьведкі» размаўляць зь ім на беларускай мове (***увага! дзяржава наша дзьвюхмоўная, што патрабуе ад дзяржаўных службаў ведаць абедзьве мовы, ад іншых грамадзянаў веданьне абедзьвюх моваў не патрабуецца; таму любы чалавек мае права патрабаваць ад прадстаўніка дзяржаўнай установы размаўляць зь ім на той мове, якую гэты чалавек разумее***). Сьледчы адмовіўся выканаць гэтае патрабаваньне, хаця заявіў, што беларускую мову ведае, і папракнуў спадара Булавацкага «нацыяналізмам». Далей была размова, дзе кожны карыстаўся сваёй мовай. Адказы Булавацкага на пытаньні сьледчы перакладаў і запісваў на сваёй мове. Вось адзін прыклад яго новай моўнай практыкі:

– Ваша партийность и должность в партии?

– Старшыня Магілёўскай філіі Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады.

Сьледчы запісвае: «... старшина Могилёвского филиала Белорусской социал-демократической Громады».

І так далей. Па заканчэньні размовы сьледчы прапанаваў падпісаць запісанае ім «Объяснение». М.Булавацкі напісаў: «Спадар Краўчанка Зміцер Мікалаевіч адмовіўся размаўляць са мной на беларускай мове, якую я ведаю, і размаўляў на рускай мове, якую я ведаю кепска. Тэкст напісаны на рускай мове і таму я не маю магчымасці ацаніць дакладнасць зафіксаваных слоў. Можна лічыць, што з гэтым тэкстам я не знаёмы».

Атрымалася, што з-за няведаньня беларускай мовы сьледчы дарма страціў паўгадзіны свайго працоўнага часу. Ці ў сьледчых пракуратуры гэтага часу хапае?

Багдан МІХАЙЛАЎ



Малітва дня – для памяці і роздуму

Старшыням рэгіянальных ды іншых суполак БНФ, МФ і іншым патрыятычна-нацыянальным арганізацыям.

Жыве Беларусь!

Зянонe наш, які ёсьць у Польшчы. Няхай сьвятам будзе для электарата пачуць імя твае. Прыйдзі прэзыдэнцтва твае. Будзь факсы твае, як на Беларусі, гэтак і ў Амэрыцы. Заробак наш штодзённы дай нам у тэрмін. І прабачай нам нашыя здрады, як і мы прабачаем лукашыстам. І не навядзі на нас АМАП, але пазбаў нас ад Лукі. Рубон!

Што сёньня значыць – быць сэрбам

Там гнёзды спалены, там птушаняты зьнішчаны. Сьмяротны дым плыве над папялішчамі.

Пімен Панчанка

У кожнага з нас хутчэй за ўсё ёсьць праблемы, бо ў жыцьці бязь іх не абыйсьціся: кагосьці кінуў хлопец; кагосьці не пушчаюць на дыскатэку; хтосьці пасварыўся з бацькамі ці сябрамі; у кагосьці скончылася чарговая «доза» й няма за што набыць новую...

Але ўсе гэтыя нашы «глябальныя» моладзевыя праблемы згасаюць перад тым, што перажываюць сёньня аднагодкі там, дзе ідзе вайна... Як ні дзіўна, але мы заўсёды ў часы нашых нягод забываем нават пра самых блізкіх людзей, пра іхныя пакуты. А тут нібы такая далечыня. Але ж турбуе мяне гэта, кранае.

Мажліва, ня маю права меркаваць, бо ніколі ня быў у гэтакім пекле – пекле вайны, не спытваў гэтых жахаў, якія абрынваюцца зараз на той кавалак эўрапейскай краіны, да якой скіраваны ўважлівыя позіркі мільёнаў людзей усяго сьвету. Югаславія -Сэрбія і Касова... Што адбываецца там – судзіце самі...

«... Раніца. 6 гадзінаў 40 хвілінаў. Я гляджу праз разьбітае шкло, як сотні людзей разграбаюць заваленыя рэшткамі будынкаў вуліцы. Сёньня я ўжо ня здолею пайсьці на працу, лекар забараніў падымацца з ложку. Ён сказаў, што мяне ссадніла, да таго ж аскромкам разьбітае калена. Сёньня да мяне яшчэ ніхто не заходзіў, верагодна яшчэ анічога ня ведаюць, а мо ведаюць ды не жадаюць турбаваць.

Учора зь сябрамі мы хадзілі на нафтаперапрацоўчы камбінат: акружаючы жывым колам хацелі хоць нешта выратаваць у нашым горадзе. Некалькі дзён мне шанцавала, але ўчора... Я ня памятаю нічога, казалі, што ні драпіны мне жаўнеры прынесьлі ў бомбасховішча.

Хутка сонца, халера на яго, узьнімецца вышэй, разыйдуцца хмары, ды зноўку, зноўку ўдарыць у вушы акрамя звона ад кантузыі вой сырэны трывогі.

Божа, як я стаміўся, як мне надакучыла жыць, як надакучыў пах штукатурнага пылу й звон шкла... Я хутка зьеду з глузду... Хто-небудзь, дапамажыце мне, выратуйце, дайце памерці... Людзі... Вады...

Але зноўку вой сырэны, выбухі, стогны параненых і нічога болей. Колькі гэта будзе доўжыцца – гэтага ніхто ня ведае, ніхто, акрамя НАТА...»

Алесь ЛІНДАРЭНКА

Па сакрэту — ўсяму сьвету...



– Невядомымі тэрарыстамі дзямі быў захоплены старшыня абласной «прэзыдэнцкай» выбарчай камісіі Ўладзімер Шарапаў. Яны патрабуюць выкуп: 1500 даляраў! Натоўпы сябраў участковых выбарчых камісіяў пацягнуліся да штаб-кватэры абласной камісіі, каб аддаць свае ўласныя грошы на карысьць вызваленьня сп. Шарапава. Людзям не абыякавы ягоны лёс!

– Рэдактар «Бадзягі» вынес строгую вымову супрацоўніку рэдакцыі (ён пажадаў застацца невядомым), які спрабаваў арганізаваць пад шыльдай праекту «Вольная Моладзь» клюб аматараў піва. Клюб зачынены, праект «вісіць» у паветры...

– Пятага травеня, каля Магілеву, быў затрыманы аўтамабіль, у якім знаходзіўся «агент заходніх спецслужбаў», намесьнік старшыні абласной выбарчай камісіі па выбарах 16 травеня Хвёдар Анатольсеў па мянушцы Анатоль Фёдаравіч. У яго былі сканфіскаваныя 42 тысячы выбарчых бюлетэняў, якія ён зьбіраўся здаць на макулатуру ў абмен на кнігу «Так гартавалася сталь». Сумленныя супрацоўнікі ДАІ затрымалі сп. Х.А. (па мянушцы А.Ф.) за незаконны ўвоз паперы на тэрыторыю вобласьці. Ён пасхаў за новымі бюлетэнямі: выбары не разьбіць, не спыніць, не стрымаць!!!

– Сёмага травеня мясцовыя маладафронтаўцы правялі экстранную нараду ў сувязі з падзеямі на Югаслаўшчыне. Было вырашана аказаць вайсковую падтрымку сп. Мілошавічу. Сёньня з раніцы эшалёны пацягнуліся ў бок заходняе мяжы. Трэба асобна адзначыць удзел магілёўскай філіі МХСС, якая забясьпечыла добраахвотнікаў [illegible] з часоў Другое сусьветнае вайны аўтаматамі «Шмайсэр». Мясцовы БПСМ ад удзелу ў мерапрыемстве адмовіўся. Згодна газэце «Беларуская Моладзёжная» правядзеньне мерапрыемства сталася магчымым, дзякуючы падтрымцы мясцовай масонскай лёжы «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу». Аднак, як ні дзіўна, магілёўская філія МФ гэты факт адмаўляе, таму што на мерапрыемстве не было заўважана аніводнага масона. Патрыёты Бацькаўшчыны – за НАТА, а патрыёты з БПСМ – за касавараў?! Нешта тут яўна ня тое.

– 8 травеня міліцыя Цэнтральнага РАУС г.Магілёва вырашыла ажыцьцявіць кантроль за ходам прэзыдэнцкіх выбараў-99. З гэтаю мэтаю яны завіталі па-сяброўску ў штаб-кватэру абласной камісіі. Надобрасумленным сябрам камісіі, канешне, гэта не спадабалася. Разьюшаныя, яны ажыцьцявілі напад на запрошаных назіральнікаў. Назіральнікі здолелі выбегчы. Пад шумок адзін з сябраў камісіі спрабаваў вынесьці скрыню за бюлетэнямі дахаты. Яго затрымалі і абвінавацілі ў спробе падмяніць бюлетэні.



Выбары пад надзейным кантролем з усіх бакоў!

Рэпарцёр бязь межаў – спэцыяльна для «Бадзягі»

... І што азначае, калі стварыў цябе Бог касоўцам

__*Ад рэдакцыі «ТМ»*__

Спачуваньне пакутнікам і ахвярам вайны – рэч настолькі нармальная, што тут і меркаваць сярод прыстойных людзей няма пра што. Зразумела, што «дарослая» рэдакцыя «ТМ» таксама супраць вайны, дзе б яна ні здаралася, і вельмі шкадуе, што чалавецтва пакуль ня ведае, а на жаль, іншага шляху вырашэньня этнічных, незалежніцкіх і нацыянальных праблемаў (глядзі «ТМ» за нумарам 15). Аднак-жа мы безумоўна супраць аднабакова-эмацыйнага, спрошчанага погляду на гэтыя праблемы і, адпаведна, на канкрэтовыя прычыны кожнай канкрэтовай вайны. Днямі Мілошавіч паведаміў, што пачынае (нарэшце!) вывад сваёй паліцыі і вайсковых падразьдзяленьняў з тэрыторыі Касова. Мэнавіта гэта зьберажэ жыцьці сэрбам, што трапляюць пад натаўскія бомбы, і касоўцам, калі яны яшчэ засталіся ў сваім краі, адкуль сэрбскі суграмадзянін – узброены салдат альбо ўзброены паліцыянт –па загаду'свайго дыктатара выганяе касавараў за тое, што яны – касавары... Калі міжнародная дэмакратычная супольнасьць пераможа ў гэтай вайне за захаваньне самога права людзей на жыцьцё ў сваім краі, – сьвет, і мы разам зь ім, яшчэ пачуем такія гісторыі з палітыкі югаслаўскага генацыду супраць альбанцаў, прачытаем такія ўражаньні відавочцаў жудаснай паліцэйскай кампаніі ў Касове, што ні аднос чалавечае сэрца ня зможа не адказаць болем, спачуваньнем і радасьцю ад перамогі сьвятла над цемрай...

Шкада, што на Балканах сёньня гінуць людзі. Аднак, калі глядзець на рэчы шчыра, адныя зь іх гінуць па сваёй віне, іншыя – бязь віны... Нам бы памятаць пра гэта ўвесь час.

__Ведай гісторыю!__

За незалежнасьць змагаюцца не з сабой

«Борьба украинского и белорусского народов за независимость привели к потере части земель» – так гаворыцца ў Савецкім энцыкляпэдычным слоўніку аб часох упадку Літоўскай дзяржавы. Але ў тых, хто больш ці менш знаёмы з гісторыяй Беларусі, паўстае заканамернае пытаньне: з кім маглі змагацца беларусы за сваю незалежнасьць?

Уся гісторыя Вялікага Княства Літоўскага шчыльна зьвязаная з гісторыяй беларускага этнасу. Дастаткова ўспомніць, дзе знаходзілася першая сталіца Княства, а знаходзілася яна ў Навагрудку. Добра вядома, што дзяржаўнай мовай Княства была беларуская мова. А якой жа мовай карысталася эліта Княства – Вялікія Князі Літоўскія? Зьвернемся да аднаго з найвядомейшых – да Вітаўта. Ён ня тое, што не выкарыстоўваў польскае, расейскае й літоўскае моваў – ён іх наўпрост ня ведаў. А Ягайла, які лічыўся польскім каралём, да сваёй сьмерці карыстаўся дапамогай беларуска-польскіх перакладчыкаў у размовах з падначаленымі. Манахі, якія прысхалі з Рыму, каб прывіць нашым продкам каталіцкую веру, вымушаны былі звяць лю перакладчыкаў, бо ніводны ліцьвін не разумеў ні папольску, ні па-расейску, а толькі па-беларуску.

Сам назоў «ліцьвін» значыць не «літовец» у сучасным сэнсе гэтага слова, а этнас, які існаваў на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Прыкладам, плямёны, якія жылі на тэрыторыі сучасных балцкіх гаспадарстваў, мелі назоў рускіх. І, дарэчы, ва ўсіх летапісах да XVII стагодзьдзя маскоўскае княства ніколі не завецца «рускім»; пры пералічэньні харугваў з розных земляў гаворыцца нешта кшталту: вої былі зь Менска, Бранска, Рязані, Смаленска, Ноўгарада і іншых дзяржаваў, а таксама з Масковіі.

Але вернемся да ліцьвінаў. Сучасныя гістарычныя дасьледваньні даказваюць, што гэта быў адзіны народ, са сваёй мовай, сваёй культурай, ды зь некалькімі рэлігіямі. І галоўны гэтаму доказ – тое, што на тэрыторыі Вялікага Княства не было аніводнага этнічнага ці рэлігійнага канфлікту. Гэты этнас утвараўся пры асыміляцыі славянскімі плямёнамі балтаў. Анасьля аб'яднаньня крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў з балтамі пачаў утварацца беларускі народ (глядзі «Бадзягу», ТМ №17(58)). Пры злучэньні валыням з палянамі ўтвараўся ўкраінскі этнас, ад паляні пайшлі палякі, з балцкіх плямёнаў (жмудзіі ды аўкштайтаў) разьвіліся сучасныя літоўцы, латвійцы.

Ня так даўно, падчас спрэчкі з адным знаёмым, які выхоўваўся ў савецкі час, я пачуў гэтакі аргумант супраць незалежнасьці Беларусі: «Беларусь появилась в 1919 году, а до этого мы были частью России». Вось мэнавіта дзеля такіх, як ён, трэба даказваць, што ў нашага народу ёсьць гісторыя. Адкуль жа прыйшоў назоў «беларусы»? Аб гэтым дагэтуль спрачаюцца гісторыкі, этнографы. Але ў XV-XVI стагодзьдзях гэты назоў азначаў прыкладна «праваслаўны ліцьвін». Зьвярнемся да пісьмовых крыніцаў. Адзін з найвядомейшых беларусаў, які шмат чаго зрабіў для разьвіцьця беларускае культуры й мовы, славянскі першадрукар Францішак Скарына заўсёды падпісваўся гэтак: «ліцьвін беларусец з Полацака доктар Фр. Скарына». Ці варта яшчэ шукаць доказаў?

Алесь ГРАМАКОЎСКІ

Бадзяга – магілёўскі моладзевы часопіс
№ 3 (3)
Галоўны рэдактар: Алесь ПАЛТАРАЦКІ
Мастацкае аздабленьне: Вольга ФЁДАРАВА, Алесь ЛІНДАРЭНКА
Рэдакцыя: Алесь Палтарацкі, Андрусь Дзьвігун, Дзяніс Башкіраў, Вольга Фёдарава
За дакладнасьць пададзенага матэрыялу рэдакцыя нясе маральную адказнасьць.

Набыткі магілёўскай паэзіі

У выдавецтве «Юнацтва» выдадзены зборнік вершаў «ДОЛЯгляд» Васіля Рагаўцова, прафэсара Магілёўскага ўнівэрсытэту. Васіль Іванавіч выдатна спалучае навуковую дзейнасьць на ніве беларускай лінгвістыкі з паэзіяй, дзе яго навуковыя набыткі знаходзяць выразнае і зьмястоўнае прымяненьне.

Наталяюся родным словам...
Яно прарастае ў душы
цнатліваю руньню,
сьпеліцца на вуснах
шапатлівым коласам,
пераліваецца на іх
залатым зернейкам...
Наталяюся
родным
словам...
Як прагавітая душа –
першацьветам.

Акрамя чароўнай мовы кідаецца ў вочы самотлівасьць паэзіі Рагаўцова.

Мёртвыя –
не прачнуцца...
А ці ж прачнуцца
жывыя?

***

Апошнюю сасну
зваліпі... для труны.
А некалі ж шумеў
вячысты бор.

***

Родны край для мяне –
як забыты вятрак,
што балюча ўзмахне
надламаным крылом...
І стылее душа,
бы зьнямоглы жабрак
пад вячыста-нямым
месяцовым сьвятлом.

Прычына такой самотлівасьці раскрытая ў словах:

Нарадзіўся, каб жыць
у самотнай краіне...

Сапраўды, якая краіна, такая і паэзія.

Віншуем магілёўскага паэта з чарговым посьпехам, зычым плёну і натхненьня. А краіну будзем выводзіць з самоты разам. Будуць пісацца ў нас іншыя вершы, будзем сьпяваць і вясёлыя песьні!.. Дажывем!..

Міхась БУЛАВАЦКІ

ЖЫЦЬЦЁВЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Пернік за мітынг

Знаёмая жанчына пахвалілася, што пойдзе на мітынг 9 траўня. Я зьдзівіўся, ведаючы пра яе адмоўныя адносіны да любых мітынгаў.

– А нам адгул дадуць, – раскрыла яна сакрэт сваёй мітынговай актыўнасьці, – лішні дзень да водпуска.

– Гэта дзе так? – пацікавіўся я.

– У абласной бальніцы.

Вось так. Зразумела, што галоўны ўрач бальніцы ня сам правіў такую ініцыятыву, у яго няма паўнамоцтваў падаўжаць водпускі сваім супрацоўнікам. Улады настолькі перастараліся ў фармаваньні адмоўнага стаўленьня да мітынгаў у насельніцтва, што цяпер ужо і за сьвяткаваньне Перамогі «пернікі» вымушаныя даваць. Думаюць, што «за так» ня прыдуць. Але-ж і сапраўды, мусіць, не прыйшлі б.

Сумна гэта. Па-першае, сумна і журботна з-за таго, што нармальныя праявы чалавечай вартасьці ўжо патрабуюць нейкага зьнешняга «падмацаваньня». Хутка, мабыць, дойдзем да таго, што будзем чакаць «пернікаў» за тое, што прайшоў па вуліцы і ня вылаяўся, ці за вымытыя рукі перад сьняданкам. Маральнасная гніль, пасеяная сёньняшнімі ўладамі, разьядае душы, заблытвае сумленьне. Няшчасная жанчына ўжо не рэагуе на дзікасьць сытуацыі, ёй падаецца цалкам нармальным атрымаць «пернік» за ўдзел у сьвяткаваньні дня Перамогі над фашызмам.

Другая ненармальнасьць у тым, што ўладныя структуры не бачаць нічога грэшнага ў выдачы такіх «пернікаў». Ня дзіва, што яны-ж і ўдзельнікаў апазыцыйных мітынгаў падазраюць і абвінавачваюць у атрыманьні нейкага хабару. Бо «за так», па іх меркаваньнях, на мітынгі ня ходзяць. Сапраўды, гучней за ўсіх крычыць «Трымай злодзея!» сам злодзей.

Гніем, браткі. Гніем...

Міхась БУЛАВАЦКІ



Зь любоўю да вас, беларускія маці...

ВАНДРОЎНЫ СЭЗОН РАСПАЧАТЫ

Пад сваім сьцягам

На травеньскія сьвяты магілёўскі клюб аматараў беларускай гісторыі і падарожжаў «Чароўны ўспамін» наладзіў сплаў з Оршы да Магілёва. На пяці байдарках па высокай вадзе Дняпра вандроўнікі прайшлі каля 100 км. Для большасьці ўдзельнікаў гэта быў першы водны паход, пэўная вучоба і выпрабаваньне, якое яны з гонарам вынесьлі. Ні дажджы, ні халоднае надвор'е не змаглі сапсаваць прыўзьняты, сьвяточны настрой групы. Ды як ён мог быць іншым, калі на прывалах і біваках сьпявалі такія вядомыя беларускія барды, як Андрэй Мельнікаў ды Ігар Мухін. Гарманічна гучалі мэлядычныя баляды Паўла Пастухова, да спадобы прыйшліся і расейскамоўныя сьпевы ў выкананьні Аляксандра Іванчанкі. Калі да гэтага дадаць яшчэ жарты ды турысцкія «байкі-казкі» больш вопытных «валацугаў» Уладзімера Краўчанкі і Алеся Агеева, насычаную гістарычную праграму, то стане зразумела – сумаваць не было калі.

Мабыць яшчэ больш узьнімала настрой тое, што тры дні мы йшлі па сваёй краіне пад сваім сьцягам. На берагах сустракаліся рыбакі, мінакі, сярод іх былі міліцыянты і вайскоўцы, але ніводнага адмоўнага камэнтару на адрэсу бел-чырвона-белага сьцягу не было. Аршанскія мужыкі пракамэнтавалі яго зьяўленьне такім чынам: «Пад **нашым** сьцягам пайшлі хлопцы», а магілёўскія юнакі і дзяўчаты з «Патрыётаў Бацькаўшчыны», убачыўшы яго ў Магілёве, выдалі такі крык радасьці, што прыцягнулі ўвагу ўсіх адпачываючых ля палаца «Хімвалакно»... Сапраўды, добра, што ўлады не дадумаліся яшчэ прыраўняць рух на рэках да руху на дарогах, а сплаў па іх – да дэманстрацыі.

Надзвычай цікавай аказалася гістарычная праграма падарожжа. Ніхто з турыстаў мабыць і не чакаў такой насычанасьці помнікамі гэтага маршруту. Экскурсія аршанскага краязнаўцы Юркі Копціка пераўтварыла звычайны райцэнтар у, як кажуць, лялечку. Асабліва ў Воршы ўсіх уразіла баракальная Куцейнская Троіцкая царква магілёўскай школы дойлідзтва, якая з-за павароту Дняпра выплыла як фантастычны прывід зь мінулага. Не пакінулі абыякавымі вандроўнікаў велічныя валы Копыскага гарадзішча й мураваныя сьцены вакол сядзібы ППРБ у Шклове. А яшчэ былі экскурсіі ў



Варшанскі этнаграфічны музэй «Млын» і музэй Янкі Купалы ў Ляўках, цудадзейная вада Палыкавіцкай крыніцы, каплічка на нямецкіх могілках у Магілёве і, безумоўна, маляўнічыя разнастайныя відарысы поймы Дняпра.

Аб горадзе Шклове трэба сказаць асобна. Сёньня агурковая сталіца Беларусі рыхтуецца да «Дажынак-99». Увесь горад разрыты да непазнавальнасьці: рэканструкцыя чыгуначнага, будоўля нанова аўтобуснага вакзалу... Пасьля сьвята ў Шклове зазьзяюць басэйн і начная дыскатэка, новы гатэль і новы выезд на Магілёў. Блізіцца да завяршэньня адбудова «вэтэрана» абласной рэканструкцыі – Шклоўскай ратушы. І ўсё было б добра, каб не рабілася ўсё гэтак па-савецку, быццам бы краіна на ўздыме і мы ня ведаем, куды падзець лішнія грошы. На жаль, усе аб'екты будуюцца сьпехам, неахайна і няякасна. У горад нагналі да 5-ці тысячаў будаўнікоў, з-за якіх цяпер у Шклове не хапае хлеба і немажліва прабіцца ў лазьню. Пакуль гэтыя рабочыя ня столькі будуюць новы, колькі ламаюць стары горад: сьпілоўваюць дрэвы, выламваюць яшчэ добрую тратуарную плітку й прапіваюць яе. Дарэчы, шклоўскія «хрушчоўкі» зьбіраюцца пакрываць чарапіцай! Як сьмяюцца будаўнікі: «Зь вялікага Шклова мы зробім маленькі Парыж!» Праз колькі гадоў дажынак гэты беларускі райцэнтар стане нагадваць французскі гарадок? Ці толькі захаваюцца гэтыя сьпехам зьлепленыя «пацёмкінскія вёскі»?

...Вандроўка заўсёды пакідае шматлікія ўражаньні й успаміны, у тым ліку й ня толькі вясёлыя. Звычайна сярод падарожжа наступае момант, калі ты задаесься пытаньнем: «Навошта я сюды пайшоў?..» Але праходзіць некалькі дзён пасьля ягонага заканчэньня, і ты ўжо марыш пра наступае вандраваньне.

Алесь АГЕЕЎ

Рэдактар Генадзь СУДНІК

Тыднёвік Магілёўскі

Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадзкой асацыяцыяй «КОЛА СЯБРОЎ».

Зарэгістраваная ў Дзяржкамітэце РБ па друку за № 831.

Газэта выходзіць штočацьвер.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

Тэлефон: 31-04-15,
Тэл./факс: 22-97-82,
E-mail: krug@user.unibel.by

Газэта надрукаваная афсэтным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 19. Наклад 500 асобнікаў.